Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 ЖНІЎНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 144
(26257)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Ліст у нумар

БУДЗЕ ЖЫЦЬ ГАЗЕТА...

Мы ідзём па сцяжынках, на якія не вернемся.
Мы ідзём па дзіцячых здзічэлых лясах...
Павуцінка ўверсе, павуцінка ўверсе,
Павуцінка ў тваіх і маіх валасах.

Не вам казаць — чым больш іх, гэтых павуцінак, тым больш у чалавека хвароб. Але я, здаецца, знайшоў паратунак (апроч лекаў): захварэўшы, заўсёды чытаю нашых беларускіх пісьменнікаў. І тых, што ўжо адышлі ў лепшы свет, і тых, што працуюць цяпер. Пад рукой заўжды свежы нумар газеты «Звязда» — з «Простаю моваю», з «Простымі рэчамі», з роздумамі Адама Глобуса і «Дзённікам бландзінкі». Чытаючы іх, час ад часу сустракаю да болю мілыя родныя слоўцы, напаўзабытыя выразы і ў памяці міжволі абуджаюцца пранізлівыя, шчымлівыя ўспаміны, мяняецца настрой, ідзе магутная энергетычная падтрымка.

Не ўтаю, былі ў жыцці два выпадкі, калі ад газеты я адмаўляўся — па ўважлівай прычыне. У першы — жонцы рабілі аперацыю на зрок, мы з ёй амаль два месяцы жылі ў Мінску і «Звязду» я шторанак шукаў у шапіках (што, дарэчы, досыць складана!). У другі — збянтэжыў адзін з дадаткаў.

Але і тады я хадзіў у бібліятэку, каб праглядаць падшыўку, каб чытаць тых, каго трэба чытаць. Таму сёння, напярэддні 91 гадавіны з дня выхаду першага нумара, хачу шчыра павіншаваць газету і пажадаць ёй галоўнага: не губляць свой твар, заставацца саліднай і рэспектабельнай. У такой заўсёды будуць падпісчыкі! А будзе жыць газета — будзе жыць мова. І ўсім, хто любіць яе, будзе несці сваё цяпло і святло, а значыць здароўе.

Уладзімір МАСАЛКОЎ, *г.Віцебск*

Неабходна больш актыўна развіваць перапрацоўчую гароднінную галіну ў Беларусі

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 2 жніўня прадоўжыў рабочую паездку па краіне і наведаў Гомельскі раён.

Аляксандр Лукашэнка пазітыўна ацаніў ход уборкі збожжавых у Гомельскай вобласці. Тут ураджайнасць збожжавых у асобных гаспадарках дасягае 80 ц/га. Прычым уборка на палях Гомельскай вобласці вядзецца ў асноўным камбайнамі мясцовай вытворчасці.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што аб збожжаўборачных камбайнах «Гомсельмаша» добрыя водгукі і ў іншых рэгіёнах краіны. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што якасць гэтай тэхнікі неабходна давесці да дасканаласці, яна павінна адпавядаць лепшым еўрапейскім узорам. У гэтым годзе на экспарт адпраўлена 1,5 тыс. беларускіх збожжаўборачных камбайнаў, а ў наступным годзе плануецца прадаць за мяжу 3 тыс. адзінак.

У час даклада старшыні Гомельскага аблвыканкама Аляксандра Якабсона закраналася тэма вяртання ў севазварот раней закінутых меліяраваных земель, якіх, у прыватнасці, у Гомельскай вобласці ўжо выкарыстоўваецца амаль 100 тыс. га.

Прэзідэнт Беларусі на прыкладзе КСУП «Брылёва» Гомельскага раёна азнаёміўся з прамысловым вырошчваннем, перапрацоўкай і захоўваннем агародніны па сучасных тэхналогіях, імпартазамяшчэннем ў вытворчасці гароднінай прадукцыі. Кіраўніку дзяржавы даложана аб выкананні яго даручэнняў па развіцці вытворчасці і перапрацоўкі гародніны ў Гомельскай вобласці.

Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць больш актыўна развіваць перапрацоўчую гароднінную галіну ў краіне.

Як праінфармавалі кіраўніка дзяржавы, вытворчасць агародніных кансерваў у Беларусі ў гэтым годзе будзе павялічана ў два разы. У прыватнасці, Прэзідэнту былі прадэманстраваны ўзоры выпушчаных у «Брылёве» сухіх пюрэ цыбулі і часнаку, соку рэпчатай цыбулі. Як лічаць спецыялісты, выпуск такіх сучасных і зручных для ўжывання відаў агародніннай прадукцыі можа стаць сапраўдным пераворатам у харчовай прамысловасці.

На думку старшыні Гомельскага аблвыканкама, вытворчасць агародніны цяпер з'яўляецца найбольш рэнтабельнай. Аляксандр Лукашэнка наведаў цэхі абноўленага кансервавага завода ў КСУП «Брылёва», з канвеераў якога сыходзіць не толькі кансерваваная, але і замарожаная прадукцыя. На выстаўцы свежай і кансерваванай агародніны, а таксама пладоваягадных він Прэзідэнту прадэманстравалі ўзоры новай агародніны, што вырошчваецца ў гаспадарцы.

У экспазіцыі была таксама прадстаўлена вядомая сваімі ўнікальнымі лекавымі ўласцівасцямі растаропша, якая вырошчваецца ў КСУП «Брылёва». У час наведвання «Брылёва» размова ішла таксама аб магчымасці прамысловага вырошчвання вінограду, сок якога ў перспектыве можа выкарыстоўвацца ў каньячнай вытворчасці.

Прэзідэнту расказалі і аб ураджайнасці пасеваў. Былі закрануты тэма развіцця ў краіне магутнасцяў захоўвання гародніны і праблема з іх рэалізацыяй, магчыма, праз таварную біржу. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў неадкладна вырашыць пытанні з закупкай свежавырашчанай капусты для беларускай сталіцы.

Прэзідэнт пазітыўна ацаніў праекты, што рэалізуюцца ў КСУП «Брылёва».

У гэты ж дзень Аляксандр Лукашэнка наведаў Гомельскі палацава-паркавы ансамбль. Ён зрабіў экскурсію па тэрыторыі парку, агледзеў музейныя экспазіцыі палаца Румянцавых і Паскевічаў.

Прэзідэнт агледзеў залу ўрачыстых прыёмаў, чырвоную гасціную, калонную залу. У камернай канцэртнай зале музыканты выканалі некалькі твораў. Музейны збор палацава-паркавага ансамбля сёння налічвае больш за 157 тыс. адзінак.

Як адзначаюць спецыялісты, у час вайны з палаца было вывезена амаль 2 тыс. 700 прадметаў, вярнулася ж крыху больш за 200, сярод якіх падарункі, асабістыя рэчы Паскевічаў.

У 1996 годзе тут былі пачаты рэстаўрацыйныя работы, якія вядуцца ў тым ліку і з прыцягненнем спонсарскіх сродкаў. Як далажылі Прэзідэнту, асноўныя рэстаўрацыйныя работы плануецца завяршыць ужо ў наступным годзе.

Аляксандр Лукашэнка пакінуў запіс у Кнізе водгукаў ганаровых наведвальнікаў палаца. У ім, у прыватнасці, адзначаецца, што Гомельскі палацава-паркавы ансамбль з'яўляецца адной з жамчужын нацыянальнай культуры, адным з помнікаў, якія па праву служаць візітнай карткай краіны, вызначаюць яе ўнікальнасць і самабытнасць, напаўняюць грамадзян краіны гонарам за мінулае і сучаснае Айчыны.

У час прагулкі па тэрыторыі парку Прэзідэнт паразмаўляў з гамяльчанамі, якія адпачывалі там. У прыватнасці, гараджан цікавіла, ці будзе Аляксандр Лукашэнка вылучаць сваю кандыдатуру на будучых прэзідэнцкіх выбарах. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што лічыць заўчасным гаварыць аб магчымасці свайго ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах.

«Апазіцыя перажывае, што мой малодшы сын будзе наступным Прэзідэнтам і тады я буду кіраваць дзяржавай да 80 гадоў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён дадаў: «Не палохайце пакуль апазіцыю, ёсць шмат добрых людзей, якія могуць быць прэзідэнтамі».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АЛІМПІЙСКАЯ «ПРЫКІДКА»

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

Карэспандэнт «Звязды» стала лаўрэатам фотаконкурса аб спорце і здаровым ладзе жыцця

У мінулыя выхадныя ў сталічным кінатэатры «Цэнтральны» прайшла выстава пад дэвізам ...сёлетніх Алімпійскіх гульняў: «Адзін свет — адна мара». Гледачы ўбачылі фотаздымкі нашых алімпійскіх чэмпіёнаў, многія — упершыню. Другая частка выставы — работы пераможцаў фотаконкурса аб спорце і здаровым ладзе жыцця, на якіх сучасныя дзеці, як і калісьці алімпійскія чэмпіёны, робяць свае першыя крокі на шляху да Алімпа. Прыемна адзначыць, што сярод пераможцаў конкурсу і фотакарэспандэнт нашай газеты Марына Бегункова. Віншуем калегу!

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ АЛЯКСАНДР САЛЖАНІЦЫН

Слынны рускі пісьменнік лаўрэат Нобелеўскай прэміі Аляксандр Салжаніцын памёр на 90-м годзе жыцця ў ноч на панядзелак у Маскве.



Паводле папярэдніх звестак, прычынай смерці пісьменніка стаў інсульт. Як удакладняюць інфармагенцтвы са спасылкай на сына нябожчыка Сцяпана, Аляксандр Ісаевіч памёр дома. Смерць наступіла ў 23.45 па маскоўскім часе ў нядзелю. Да гэтага Салжаніцын доўга хварэў, але працягваў займацца актыўнай творчай дзейнасцю. Разам з жонкай Наталляй Дзмітрыеўнай — прэзідэнтам яго фонду — пісьменнік працаваў над падрыхтоўкай і выданнем свайго самага поўнага 30-томнага збору твораў.

Аляксандр Ісаевіч будзе пахаваны ў сераду на могілках Данскога манастыра Масквы. Паводле слоў сакратара Аддзела знешніх царкоўных сувязяў Маскоўскага патрыярхата пратаіерэя Мікалая Балашова, могілкі Данскога манастыра былі абраны самім Аляксандрам Ісаевічам яшчэ пры жыцці. «Пяць гадоў назад у адказ на яго зварот Найсвяцейшы Патрыярх Аляксій блаславіў замацаванне ўчастка на могілках для пахавання Аляксандра Салжаніцына», — заявіў Балашоў.

ЖНІВО-2008

На жніве працуе каля 11 тысяч камбайнаў

На 4 жніўня на ўборцы ўраджаю працавала 10 772 збожжаўборачныя камбайны, або каля 79 працэнтаў ад існуючага парку збожжаўборачнай тэхнікі, паведамілі рэдакцыі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання. Такім чынам, у жніве не ўдзельнічала 2830 камбайнаў, з якіх па ўмовах дрэннага надвор'я прастойвала 1940, а па тэхнічных прычынах — 616 адзінак тэхнікі.

Сяргей ПАЛІНІН.

ISSN 1990 - 763X

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже следующего имущества ОАО «Червенский молочный завод» (пл. зем. уч. 3,47 га), в том числе здания и сооружения: корпус завода (общ. пл. 2 431,4 кв.м), административное здание (общ. пл. 442,4 кв.м), склад казеина (общ. пл. 121,5 кв.м), мастерские (общ. пл. 269,2 кв.м), материальный склад (151,3 кв.м), склад (общ. пл. 172,8 кв.м), гаражи (общ. пл. 301,8 кв.м), мойка автомолочных цистерн и прачечная мойки спецодежды (159,9 кв.м), незавершенное строительство производственного цеха (общ. пл. 4 376 кв.м), резервуары подземные (2 ед.), подъезды и площадки, внешние сети трубопровода, внеплощадочные сети чугунные, теплицы, труба дымовая; оборудование для производства кисломолочных изделий, транспортные средства (автомобили ГАЗ 3110 Волга, УАЗ 3303, автопогрузчик дизельный вилочный, электропогрузчик вилочный), мебель, оргтехника, компьютеры и др. имущество. Начальная цена снижена на 40 % и составляет – 2 271 000 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.04.2008 г. **Аукцион состоится 20.08.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19.08.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны (8017) 224 61 34, (80293) 659569.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже конфискованного имущества: двухкомнатная квартира № 127, расположенная по адресу: г. Минск, проспект Машерова, д. 76 (общая площадь – 46,9 кв.м, жилая площадь – 26,8 кв.м).

Начальная цена — 213 132 690 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о регистрации (для юридических лиц); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Задаток в размере 21 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. **Аукцион состоится 20 августа 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 18 августа 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017) 227 48 36.

УНП 190398583

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже имущества, обращенного в доход Республики Беларусь:

Лот № 1 – квартира № 25 и квартира № 26 (объединенные в одну квартиру общей площадью 153,5 м кв., жилой площадью 108,1 м кв.), расположенные по адресу: г. Минск, проспект Независимости, д. № 76а в г. Минске. Начальная цена — 624 130 650 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о регистрации (для юридических лиц); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Задаток в размере 60 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. **Аукцион состоится 20 августа 2008 года в 11.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 18 августа 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017) 227 48 36.

УНП 190398583

З 1 жніўня павышаюцца памеры працоўных пенсій па ўзросце ў сярэднім на 11,2 працэнта

У мэтах павышэння ўзроўню матэрыяльнай забеспечанасці пенсіянераў, выканання паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі на 2008 год па ўзроўні пенсійнага забеспячэння з 1 жніўня 2008 года ў Беларусі павышаюцца памеры працоўных пенсій па ўзросце ў сярэднім на 11,2 працэнта. Адпаведны Указ Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў 4 жніўня. У выніку сярэдняя працоўная пенсія па ўзросце ў жніўні складзе Br408,1 тыс.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

НА АДАПТАЦЫЮ ДА НОВЫХ ПРАВІЛАЎ — ДВА ГАДЫ

Беларуская мова — дзяржаўная мова нашай краіны — адыгрывае выключна важную ролю ў жыцці сучаснага беларускага грамадства. Унармаванасць літаратурнай мовы, захаванне адзінства арфаграфічных нормаў у значнай ступені забяспечваюць стабільнасць у сферы моўнай камунікацыі і маюць дзяржаўнае і палітычнае значэнне. Як будзе ажыццяўляцца пераход на новыя правілы арфаграфіі і пунктуацыі ў сувязі з прыняццем адпаведнага закона, расказаў у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА міністр адукацыі Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ.

— Аляксандр Міхайлавіч, у 2006 годзе кіраўнік дзяржавы паставіў перад спецыялістамі вашага ведамства і іншымі зацікаўленымі вельмі сур'ёзную і, можна сказаць, «ювелірную» задачу — распрацаваць новыя правілы арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы. Закон прыняты, значыць, задача вырашана?

— Вы маеце рацыю, задача была сапраўды «ювелірная» — мы хацелі, не праводзячы ніякіх рэформаў, абнавіць і прывесці да адпаведнасці існуючыя правілы арфаграфіі і пунктуацыі. Думаю, што аўтарскі калектыў, які распрацоўваў новую рэдакцыю правілаў, са сваёй задачай справіўся на ўсе 100 працэнтаў. У яго ўвайшлі супрацоўнікі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, іншыя вучоныя, а таксама настаўнікі-філолагі. Дарэчы, хачу падкрэсліць, што новая рэдакцыя — гэта толькі ўпарадкаванне існуючых правілаў.

— Але ж існуе, напрыклад, англійская арфаграфія, якая не мяняецца стагоддзямі?

— Так, сапраўды, англійская арфаграфія не мянялася прыкладна з XIV стагоддзя. Гэта, з аднаго боку, забяспечыла пераемнасць і паслядоўнасць яе выкарыстання пакаленнямі брытанцаў і іншых карыстальнікаў мовы, а з другога, стварыла цяжкасці, сэнс якіх можна праілюстраваць даволі распаўсюджаным афарызмам: «Пішацца Манчэстэр, а чытаецца Ліверпуль».

Мы б не хацелі, каб такія цяжкасці ўзнікалі ў тых, хто вывучае беларускую мову. Разам з тым, у другой палове XX стагоддзя лексіка беларускай мовы асабліва інтэнсіўна папаўнялася неалагізмамі і запазычаннямі. А калі ўлічыць, што беларускі правапіс у значнай ступені заснаваецца на фанетычным прынцыпе (асабліваслі вымаўленне перадаюцца на пісьме), то з'яўленне новых слоў патрабавала адлюстравання ў правілах правапісу. Да таго ж найбольшая колькасць выключэнняў з асноўных правілаў у беларускай арфаграфіі звязана з напісанне іншамоўных слоў. Менавіта імкненне падпарадкаваць напісанне слоў іншамоўнага паходжання асноўным правілам правапісу слоў спрадвечна беларускіх і было асноўнай прычынай арфаграфічнага разнабою ў тэкстах беларускамоўных друкаваных выданняў.

— Звяртаючыся да гісторыі: якую ролю ў развіцці беларускай пісьмовай мовы адыграла «Граматыка» Тарашкевіча?

— У «Беларускай граматыцы для школ» Браніслава Тарашкевіча, апублікаванай у 1918 годзе, фактычна ўпершыню былі сфармуляваны асноўныя правілы беларускага правапісу. «Граматыка» адыграла выключную ролю ў распаўсюджанні беларускай пісьмовай мовы ва ўсіх сферах жыцця, у першую чаргу ў адукацыі. Але разам з тым у гэтым выданні засталося дастаткова шмат спрэчных і нявырашаных пытанняў, якія датычыліся ў першую чаргу замежных слоў, што адзначае і сам аўтар.

У далейшым найбольш вострыя і спрэчныя пытанні беларускага правапісу неаднаразова абмяркоўваліся мовазнаўцамі і педагогамі. Рэформа 1933 года не вырашыла ўсіх праблем пісьмовай беларускай мовы. Работа па ўдасканаленні правапісу прадаўжалася.

Апошні раз «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» былі выдадзены ў 1959 годзе. Сама кніга ўжо даўно стала бібліяграфічнай рэдкасцю. Акрамя таго, засталіся нявырашанымі некаторыя пытанні, якія ў прыватнасці датычацца правапісу слоў іншамоўнага паходжання.

А ў 1993 годзе была створана дзяржаўная камісія, якая разгледзела асноўныя праблемы беларускага правапісу. Вынікам работы экспертаў сталі вывады, апублікаваныя ў 1994 годзе ў газеце «Звязда». Эксперты пацвердзілі, што «неабходна падрыхтаваць новую рэдакцыю дзеючых правілаў арфаграфіі і пунктуацыі і ўнесці тыя змяненні, якіх патрабуе сучасная моўная практыка». Пасля публікацыі вывадаў пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі была створана рабочая група пад кіраўніцтвам акадэміка Аляксандра Падлужнага па падрыхтоўцы новай рэдакцыі Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. У 1998 годзе быў прадстаўлены не першапачатковы варыянт, які потым неаднаразова абмяркоўваўся і дапрацоўваўся з улікам заўваг і пажаданняў, выказаных у працэсе дэбатаў. На завяршальным этапе падрыхтоўкі новай рэдакцыі Міністэрства адукацыі стварыла новую рабочую групу, якая канчаткова дапрацавала правілы з улікам заўваг і прапаноў, прысланых па выніках абмеркавання.

Вынікам работы вялікага аўтарскага калектыву стала падпісанне 23 ліпеня гэтага года закона «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Гэты дакумент дасць магчымасць забяспечыць стабільнасць правапісных нормаў, пераемнасць пісьмовай практыкі і аблегчыць працэс вывучэння беларускай мовы ў школе.

— Дарэчы, аб навучальным працэсе — калі з новымі правіламі будуць азнаёмлены педагогі?

— Новыя правілы арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы будуць уводзіцца паступова. Плануецца, што ўжо на жнівеньскіх педагагічных канферэнцыях філолагі атрымаюць неабходную інфармацыю. Але ў любым выпадку, як у школе, так і ў вышэйшых навучальных установах, ад навучэнцаў і студэнтаў ніхто не будзе патрабаваць 1 верасня 2008 года выкарыстання толькі новых правілаў. Усё павінна ісці сваім парадкам. Да 2010 года дапускаецца выкарыстанне і таго, і другога варыянтаў.

— Але ж увядзенне новых нормаў патрабуе перавыдання вялікай колькасці літаратуры, прычым не толькі вучэбнай, але і навуковай: слоўнікаў, энцыклапедый, даведнікаў і г.д.?

— Думаю, што тэрміновае перавыданне гэтай літаратуры не спатрэбіцца. У школах яна будзе заменена ў працэсе натуральнага абнаўлення літаратуры. Магчыма, першыя падручнікі з'явяцца ўжо ў 2009 годзе. Спадзяюся, што аўтарскія калектывы кампетэнтна падыдуць да гэтай работы. Але паўтараю: спяшацца ў гэтай сферы нельга.

На апошнім пасяджэнні аўтарскага калектыву распрацоўшчыкаў правілаў былі ўнесены таксама некаторыя прапановы па выданні беларускай энцыклапедыі мовы, педагагічна-энцыклапедычнага слоўніка, перавыданні беларускай граматыкі, некаторых слоўнікаў. План па ўвядзенні ў жыццё новых правілаў беларускай мовы будзе распрацаваны ў бліжэйшы час.

— А як пройдзе тэсціраванне і іншыя іспыты летам 2009 года, ці павінны будуць абітурыенты здаваць тэсты з новаўвядзеннямі?

— Не, новаўвядзенні не адаб'юцца негатыўна на навучальным працэсе і не паўплываюць на вынікі экзаменаў пры паступленні ў ВНУ. У 2009 годзе ўсе абітурыенты, школьнікі, студэнты змогуць здаць экзамены па старых правілах. А тэсты будуць распрацаваны з улікам таго, каб як мага менш новаўвядзенняў у іх трапіла. Там, дзе гэтага пазбегнуць не ўдасца, мы будзем залічваць абодва варыянты адказу.

Пры праверцы дыктантаў, сачыненняў, тэстаў — усяго вучэбна-кантрольнага матэрыялу — да 2010 года педагогі будуць дапускаць абодва варыянты. Толькі ў 2010 годзе правілы будуць абавязковыя для ўжывання ў дакументаабароце, сродках масавай інфармацыі, школах, гімназіях, ПТВ, ССНУ, ВНУ, навуковых і іншых установах.

Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.

Найбольш істотныя арфаграфічныя змяненні ў новай рэдакцыі «Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі»

1. Пашыраецца прынцып перадачы акання ў словах іншамоўнага паходжання. Прапануецца, напрыклад, пісаць адажыа, трыа, сальфеджыа і пад. (паводле дзеючых «Правілаў» пішацца адажыо, трыо).

2. У словах іншамоўнага паходжання, акрамя імёнаў уласных, канцавыя элементы -эр, -эль у адпаведнасці з прынцыпам акання прапанавана перадаваць як -ар, -аль: прынтар, камп'ютар, (паводле дзеючых «Правілаў» пішацца прынтэр, камп'ютэр).

3. Паводле агульнага правіла перадачы на пісьме якання ў першым пераднаціскным складзе прапанавана пісаць словы дзявяты, дзясяты, сямнаццаць, васемнаццаць (паводле дзеючых «Правілаў» пішацца дзевяты, дзесяты, семнаццаць, васемнаццаць).

4. У адпаведнасці з сучаснай моўнай практыкай уносяцца змяненні ў напісанне складанаскарочаных слоў. Прапануецца пісаць прафкам, гаркам, абкам, селькар, газпрам і г.д. (паводле дзеючых «Правілаў» пішацца прафком, гарком, абком, селькор, газпром).

5. Уніфікуецца напісанне прыметнікаў на -ск(і), утвораных ад уласных назваў. Прапануецца пісаць чаньчунскі, цяньшанскі як і любанскі, астраханскі (паводле дзеючых «Правілаў» пішацца любанскі, астраханскі, але чаньчуньскі, цяньшаньскі).

6. Пашыраецца напісанне «ў» (у нескладовага) у словах іншамоўнага паходжання. Прапанавана пісаць для ўніверсітэта, пасля ўнікальнай аперацыі і г.д. (паводле дзеючых «Правілаў» пішацца для універсітэта, пасля унікальнай аперацыі).

7. Спрошчаны правілы пераносу слоў.

8. У адпаведнасці з рэаліямі ўпарадкавана напісанне вялікай і малой літар у назвах органаў улады, арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, а таксама ў назвах асобаў па пасадах, званнях, тытулах і г.д. (напрыклад, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі і г.д.).

9. Уведзены новы параграф «Вялікая і малая літары ў назвах асобаў, звязаных з рэлігіямі, назвах міфалагічных і казачных герояў». Напрыклад: «З вялікай літары пішуцца асабовыя назвы вышэйшых божастваў (бостваў) у рэлігійных культах, а таксама ўсе словы ў спалучэннях, якія змяшчаюць гэтыя назвы: Бог, Яхве, Усявышні, Уладыка Нябесны...»

10. У пачатку і ў сярэдзіне слоў гукавое спалучэнне [й] + галосны перадаецца ётаваным галоснымі, як і ў словах уласнабеларускіх: ёркшырскі, маёр, маярат, маянэз, раён, Ёжэф, Нью-Ёрк.

11. Са зводу правілаў выключаны раздзелы «Галосныя ў некаторых ненаціскных канчатках назоўнікаў», «Галосныя ў некаторых канчатках прыметнікаў і займеннікаў», «Галосныя ў некаторых канчатках лічэбнікаў», «Галосныя ў ненаціскных асабовых канчатках дзеясловаў». Палажэнні гэтых раздзелаў датычацца не правапісу, а словазмянення і знаходзяць сваё адлюстраванне ў граматыках беларускай мовы.

12. Уведзены новы раздзел «Правапіс некаторых марфем», у якім у сістэмным выглядзе сабраны звесткі пра правапіс прыставак, суфіксаў. У «Правілах» 1959 года гэтыя звесткі змяшчаліся ў параграфах аб правапісе часцін мовы і былі раскіданы па ўсім зводзе правілаў.

13. Рэгламентавана ўжыванне суфіксаў -ава-(-ява-) і -ірава- (-ырава-). Напрыклад, ліквідаваць,а не ліквідзіраваць, акліматызаваць, а не аклімацізіраваць, але камандзіраваць, а не камандаваць, будзіраваць, а не будаваць і г.д.

14. У новай рэдакцыі ліквідаваны спасылкі на іншыя параграфы і раздзелы, якіх у «Правілах» 1959 г. налічвалася каля 40.

15. У адпаведнасці з сучасным узроўнем лінгвістычнай навукі ўдакладнены фармулёўкі правілаў.

16. Правілы па-новаму згрупаваны, што робіць іх больш зручнымі для карыстання і засваення.

17. Абноўлены і актуалізаваны ілюстрацыйны матэрыял.

ЦЁПЛА і ХОЛАДНА?

У чацвер і пятніцу дажджоў ужо не прадбачыцца. Тэмпература ўначы на чацвер 8—13, удзень — 18—23. У пятніцу пацяплее, калі ўдзень стане 23—26. На выхадныя зноў чакаюцца дажджы. Тэмпература ў суботу ўдзень — 20—26, у Гомельскай вобласці — да 28 цяпла, у нядзелю ўдзень — да 18—24.

Сяргей КУРКАЧ.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.08.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 113,00
1 еўра	3 293,43
1 латвійскі лат	4 671,68
1 літоўскі літ	953,84
1 чэшская крона	137,88
1 польскі злоты	1027,02
1 расійскі рубель	90,28
1 украінская грыўня	455,00

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	23,4039
10 UAH	50,1154
1000 BYR	11,0657
EUR	36,4586

Курс у гандлёвых кампаніях (на 4.08.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Ізраіля Шымона Перэса з 85-годдзем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль Шымона Перэса з 85-годдзем.

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць у тым, што ў выніку сумесных намаганняў беларуска-ізраільскае супрацоўніцтва будзе паступова пашырацца ва ўсіх сферах.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Хуткая і неадкладная службы Беларусі падзеляць паміж сабой функцыі па аказанні першаснай меддапамогі

Такая сістэма да канца года пачне працаваць ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Людміла Жылевіч.

Паводле яе слоў, у працэсе ўкаранення новай сістэмы хуткая медыцынская дапамога стане выязджаць па выкліку ў экстранных выпадках на працягу 15 мінут — прычынай можа стаць ДТЗ, траўмы, атручэнні, роды і раптоўныя захворванні, якія пагражаюць жыццю чалавека (знаходжанне хворага ў непрытомным стане, сутаргі або крывацёк) і ў некаторых іншых выпадках. Служба неадкладнай дапамогі будзе працаваць пры паліклініках і выязджаць па выкліку на працягу гадзіны ў тых выпадках, калі хворы можа крыху пачакаць. «У структуры выезду хуткай дапамогі за першы квартал гэтага года 63 працэнты выклікаў у Мінску прыпляюць пад катэгорыю неадкладных», — адзначыла Людміла Жылевіч. Часта матывацыяй выкліку хуткай дапамогі з'яўляецца алергія, галаўны боль, боль у спіне, жываце, сэрцы або сімптом пад назвай «мне дрэнна». Пацыент мае права звярнуцца па дапамогу, выклікаць хуткую. Раздзяленне службы зусім не азначае, што яму адмовяць у выездзе. Проста служба аказання неадкладнай дапамогі (тая ж хуткая дапамога, новая сістэма не прадугледжвае з'яўлення новых штатных адзінак) прыедзе крыху пазней. На пытанне аб нумарах, па якіх цяпер можна будзе выклікаць хуткую і неадкладную дапамогу, намеснік начальніка ўпраўлення адказала, што пакуль нумар застанецца адзін і той жа для абедзвюх службаў. Вырашаць, якую брыгаду накіраваць па выкліку, будзе дзяжурны фельчар.

У суд Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **ПЕТРУЦЯ Эдуарда Вячаслававіча,** 15.04.1976 года нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства — в. Рудзевічы, д. 162, Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Петруця Э.В., паведаміць іх суду Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Абзац

■ Дзяржпагранкамітэт Беларусі плануе ўвесці новую форму адзення для ваеннаслужачых у пунктах пропуску. Так, напрыклад, прапаноўваецца, каб на пунктах пропуску вайскоўцы неслі службу ў палявой форме і ў чаравіках. Акрамя таго, разглядаецца магчымасць увесці для афіцэраў і прапаршчыкаў камуфляваныя кашулі з кароткімі рукавамі.

■ У сувязі з планавым рамонтам цалкам спынены другі — адзіны дзейсны — рэактар Ігналінскай атамнай электрастанцыі (ІАЭС). Рамонт рэактара плануецца завяршыць 30 верасня. На поўную магутнасць ІАЭС пачне працаваць толькі 5 кастрычніка. Зараз Літва актыўна спрабуе пераканаць Еўрасаюз у неабходнасці падаўжэння тэрміну работы Ігналінскай атамнай электрастанцыі, якую яна пры ўступленні ў ЕС абавязалася закрыць да 2009 года. Аднак Еўрасаюз не схільны праглядаць дагавор, бо гэта было адной з галоўных умоў уступлення Літвы ў ЕС.

■ На чыгуначнай станцыі Бронная Гара Бярозаўскага раёна электрамеханік сарваўся з бетоннай апоры, на якой праводзіў работу. Ад атрыманых траўм ён памёр. Хлопцу было ўсяго 22 гады.

■ 57-гадовы аператар машыннага даення з вёскі Ляскавічы Бярозаўскага раёна трапіў пад прычэп трактара на пашы. Ад атрыманай траўмы мужчына памёр.

■ У Брэсце пабіліся два наведвальнікі дыскабара «Павуціна». Маладзейшы, 21-гадовы хлопец, застаўся без вока.

■ У вёсцы Стараволя Пружанскага раёна п'яная патасоўка закончылася наогул трагічна. 18-гадовы забіў 30-гадовага. Ракавым аказаўся ўдар нагой па галаве.

■ Пры правядзенні ўборачных работ на жніве ўвечары ў Шумілінскім раёне на полі ля вёскі Надзёжына камбайн урэзаўся ў жалезабетонную апору ЛЭП, у выніку чаго яна ўпала і правады разарваліся. Сам камбайнер не быў паранены. Застаўся цэлым і камбайн. У выніку гэтага незвычайнага ДТЗ без электразабеспячэння засталіся цэлыя чатыры населеныя пункты, дзе жывуць больш за 90 чалавек. Спецыялісты пастараліся аператыўна даць ток у вёскі.

Поўны абзац

■ Дарадчыкі італьянскага прэм'ера і медыямагната Сільвіа Берлусконі, вядомага знаўцы жаночай прыгажосці, вырашылі замаскіраваць аголеныя грудзі на знакамітай карціне-алегорыі «Час раскрывае ісціну», на фоне якой кіраўнік Італіі праводзіў адну са сваіх прэс-канферэнцый. Думка аб тым, што малюнак аголенай прыгажуні будзе мільгаць на экранах проста над галавой 71-гадовага італьянскага прэм'ера, прымусіла дарадцаў Берлусконі павесіць за яго спінай рэпрадукцыю шэдэўра з замазанымі грудзямі. Па іх меркаванні, голае цела «адцягвала б увагу гледачоў», а таксама магло «абразіць жанчын-міністраў».

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

СВЕДКА ВЫБУХУ 4 ЛІПЕНЯ, ЯКІ ВЫШУКВАЎСЯ, САМ З'ЯВІЎСЯ Ў МІЛІЦЫЮ

Чалавек, якога органы ўнутраных спраў лічаць важным сведкам у крымінальнай справе аб выбуху 4 ліпеня, адгукнуўся на заклік праваахоўных органаў і сам звярнуўся ў міліцыю. Аб гэтым БЕЛТА паведаміў начальнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі.

Ён нагадаў, што праваахоўныя органы актыўна вышуквалі мужчыну, які, на думку следства, мог мець каштоўную інфармацыю ў рамках расследавання крымінальнай справы па факце выбуху ў ноч з 3 на 4 ліпеня ў час правядзення святочнага канцэрта ў цэнтры Мінска. Яго фатаграфія была змешчана ў СМІ, а ў мінулыя выхадныя ў грамадскіх месцах сталіцы і іншых гарадоў краіны з'явілася інфармацыя з просьбай паведаміць пра сябе ў органы ўнутраных спраў. Аляксандр Ластоўскі дадаў таксама, што праваахоўныя органы значна рушылі наперад у расследаванні крымінальнай справы аб выбуху 4 ліпеня. Удалося сабраць пэўныя рэчавыя доказы, якія пасадзейнічаюць раскрыццю гэтага злачынства ў бліжэйшай будучыні.

БЕЛТА.

«ВІЦЕБСК» ВЯРТАЕ СТРАЧАНАЕ

Пяццю паядынкамі стартаваў 2 жніўня 17-ы тур чэмпіянату Беларусі па футболе ў вышэйшай лізе. Футбалісты «Віцебска» пад кіраўніцтвам новага галоўнага трэнера Аляксандра Хацкевіча атрымалі другую перамогу запар, узяўшы верх у Маладзечне над сталічным «Лакаматывам» — 3:0. Астатнія чатыры паядынкі тура прынеслі наступныя вынікі: «Савіт» (Магілёў) — «Дарыда» (Мінскі раён) — 1:1, «Шахцёр» (Салігорск) — «Днепр» (Магілёў) — 0:0, «Нафтан» (Наваполацк) — «Нёман» (Гродна) — 1:0, «Смаргонь» — «Граніт» (Мікашэвічы) — 1:0. На першым радку турнірнай табліцы размяшчаецца пасля 17 тураў барысаўскі БАТЭ, які застаецца адзінай дружынай, што не ведае паражэнняў (40 ачкоў у 16 матчах). Услед за БАТЭ размясціліся сталічны МТЗ-РІПА — 35 балаў (16 матчаў), «Віцебск» — 31 (17), «Дынама» (Мінск) — 30 (16)...

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

УТВЕРЖДЕНО:
Решением Наблюдательного Совета
ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»
Протокол № 20 от 1 июля 2008 г.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ВТОРОГО ВЫПУСКА ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»

1. Наименование эмитента на белорусском и русском языках
На белорусском языке:
полное — адкрытае акцыянернае таварыства «Беларускі Індустрыяльны Банк»;
сокращенное — ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк».
На русском языке:
полное — открытое акционерное общество «Белорусский Индустриальный Банк»;
сокращенное — ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

2. Дата и номер государственной регистрации эмитента как юридического лица, наименование регистрирующего органа, дата основания
Открытое акционерное общество «Белорусский Индустриальный Банк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 30 октября 1991 года под номером 23. Банк является правопреемником общества с ограниченной ответственностью Коммерческий банк «Профбанк» (Протокол № 1 собрания учредителей от 30 мая 1995 года).

3. Место нахождения эмитента, юридический и почтовый адрес, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Юридический и почтовый адрес: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Мельникайте, 8, тел./факс (8 017) 209 41 85, адрес в интернете: www.bib.by, e-mail: bib@bib.by.

4. Номера расчетного и валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций
№ 3811800000276 в ОАО «Белорусский Индустриальный Банк», код 725 (для юридических лиц-не банков).
№ 1811800000034 в ОАО «Белорусский Индустриальный Банк», код 725 (для юридических лиц-банков).

5. Сумма зарегистрированного уставного фонда, количество акций по категориям и типам привилегированных акций
Сумма зарегистрированного уставного фонда составляет **17 000 672 209** *(Семнадцать миллиардов шестьсот семьдесят две тысячи двести девять)* белорусских рублей.

6. Наименование периодического печатного издания, в котором публикуется бухгалтерская отчетность эмитента
Годовой отчет эмитента, бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках периодически публикуются в газете «Звязда», также с данной информацией можно ознакомиться на сайте ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» по адресу: www. bib.by.

7. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии)
Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу:
• в головном офисе ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 с **10.00** до **16.00**;
• на интернет-сайте эмитента: **www.bib.by.**

8. Дата принятия решения о выпуске облигаций, номер протокола и наименование органа, принявшего это решение
Решение о втором выпуске облигаций принято Наблюдательным Советом ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» «01» июля 2008 года, Протокол № 20.

9. Объем эмиссии, количество, форма и вид выпуска облигаций и связанные с ними права
Объем эмиссии составляет — **20 000 000 000** *(Двадцать миллиардов)* белорусских рублей.
Количество облигаций — **200 000** *(Двести тысяч)* именных дисконтных бездокументарных облигаций.
Серия **«БІ-2»**, номера **«000001—200000».**
Облигации выпускаются в виде записей на счетах. Владелец облигаций имеет право на получение номинальной стоимости (основного долга), выплачиваемой при погашении облигаций.

10. Номинальная стоимость облигаций
Номинальная стоимость облигаций – **100 000** *(Сто тысяч)* белорусских рублей.

11. Цель выпуска облигаций
Облигации выпускаются для привлечения свободных денежных средств юридических лиц.

12. Период проведения открытой продажи облигаций.
Дата начала продажи: **05 августа 2008 года.**
Дата прекращения продажи: **29 октября 2008 года.**
Срок обращения облигаций: **с 05 августа 2008 года по 11 ноября 2009 года (463 дня).**

13. Место и время открытой продажи облигаций
Открытая продажа (размещение) осуществляется:
• на внебиржевом рынке по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 ежедневно в течение банковского дня на основании договора открытой продажи (размещения) облигаций;
• на биржевом рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с регламентом торгов.

14. Срок обращения облигаций и период начисления процентов
Срок обращения облигаций: **с 05 августа 2008 года по 11 ноября 2009 года (463 дня).**
Дата погашения облигаций: **11 ноября 2009 года.**
Период начисления процентов: **с 05 августа 2008 года по 11 ноября 2009 года (463 дня.)**

15. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций
Погашение облигаций осуществляется по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 в ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» с **10.00** до **16.00** в рабочие дни, начиная с **11 ноября 2009 года.**
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента на дату, следующую за датой закрытия реестра.
Дата закрытия и формирования реестра владельцев облигаций ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» — **5 рабочих дней** до наступления срока погашения облигаций. Со дня закрытия реестра владелец облигаций обязан прекратить все сделки с облигациями.
Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев в день погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций. Списание денежных средств производится по реквизитам последнего держателя, указанного в реестре владельцев облигаций ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» на дату закрытия реестра.
Обязанности по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета эмитента по реквизитам владельцев облигаций.

16. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты
Доходность по размещаемому выпуску облигаций – 12 % годовых при размещении «до погашения» на первичном рынке. Выплата дохода по дисконтным облигациям осуществляется единовременно, при погашении облигаций.
Дисконтные облигации продаются по стоимости ниже номинальной и погашаются по номинальной стоимости.
Размер дохода по облигациям определяется как разница между номинальной стоимостью и ценой приобретения облигаций.

17. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций
Эмитент производит возврат денежных средств не позднее 10 рабочих дней со дня запрета или приостановки выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.

18. Дата и номер государственной регистрации облигаций
№ 5-200-02-0172 от «04» августа 2008 г.

19. Информация об обеспечении облигаций
Облигации выпускаются без обеспечения в соответствии с п. 1.8. Указа Президента Республики Беларусь № 277 от 28 апреля 2006 года по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь.
В соответствии с действующим законодательством общий размер обязательств по облигациям не должен превышать восьмидесяти процентов от суммы нормативного капитала. Эмитент выпускает облигации в пределах данных ограничений.

20. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия конвертации, условия и порядок досрочного погашения облигаций
Эмитент имеет право выкупить свои облигации для перепродажи или досрочного погашения. Облигации могут быть досрочно погашены по решению эмитента. При принятии эмитентом положительного решения оплата производится в течение 10 рабочих дней с момента подачи заявки на досрочное погашение.
Совершение сделок купли-продажи для юридических лиц, не являющихся профессиональными участниками рынка ценных бумаг Республики Беларусь, осуществляется на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь. Для юридических лиц – профессиональных участников рынка ценных бумаг сделки купли-продажи осуществляются на биржевом рынке в порядке, установленном открытым акционерным обществом «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Конвертация облигаций не производится.

Председатель Правления **Киреев А.Е.**
Главный бухгалтер **Кузьмицкая Н.А.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 20 от 13.02.2007 г. УНП 100195493

Хваробы стагоддзя

Інфаркт міякарда: адзін з фактараў рызыкі — спадчыннасць

Яе асаблівасці вызначылі беларускія вучоныя

Захворванні сэрца і сасудаў — лідары ў спісе пталогій, якія пагражаюць здароўю чалавека. І менавіта яны — асноўная прычына смяротнасці і інваліднасці сярод дарослага насельніцтва. Да сардэчных катастроф могуць прыводзіць многія прычыны. Аднак сярод іх медыкі выдзяляюць асноўныя фактары рызыкі: павышаны крывяны ціск і халестэрын, атлусценне, нізкую фізічную актыўнасць, няправільнае харчаванне, курэнне, цукровы дыябет. Акрамя таго, выяўлена генетычная схільнасць да інфаркту міякарда.

Менавіта беларускія вучоныя ўпершыню ў свеце вынайшлі найбольш каварныя гены.

Аб выніках даследавання, яго практычнай значнасці нам расказала **кіраўнік праекта «Распрацоўка спосабаў ДНК-дыягностыкі схільнасці да артэрыяльнай тромбафіліі», прафесар, доктар біялагічных навук, загадчык лабараторыі генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Ірма МАСЭ.**

— Інфаркты і інсульты — гэта хваробы, якія выклікаюцца трамбозамі артэрыяльных сасудаў і з'яўляюцца галоўнай прычынай смяротнасці людзей. І хаця праблема вельмі важная, артэрыяльныя трамбозы ў генетычным плане амаль не вывучаны ў свеце.

Беларускія ж генетыкі пачалі распрацоўваць праграму ў другой палове 2007 года і плануюць завяршыць даследаванні ў 2011 годзе.

Мы пачалі вывучаць тыя гены, якія адказваюць за ўзнікненне артэрыяльных трамбозаў, у прыватнасці інфарктаў міякарду. Цесна супрацоўнічаем з РНПЦ «Кардыялогія», дзе бяром узоры крыві хворых на інфаркты, а таксама з РНПЦ «Маці і дзіця».

Робіцца гэта так: з кроплі крыві выдзяляецца ДНК, і далей разглядаюцца тыя гены, якія і ў якім стане, на нашу думку, могуць выклікаць інфаркт міякарду. Такім чынам, мы даследавалі некалькі генаў і высветлілі, што адзін з іх павышае рызыку інфаркту ў два з паловай разы, а яшчэ адзін амаль у 8 разоў (па ім даследаванні пакуль не закончаны).

Варта адзначыць, што мы прапанавалі распрацоўку новага спосабу ДНК-дыягностыкі (дыягностыка схільнасці да спадчынных захворванняў). І наш спосаб прыкладна ў 10 разоў таннейшы, чым зараз існуючыя. Інакш кажучы, кошт аднаго аналізу ў 10 разоў ніжэйшы. Таму наш праект мае дзяржаўнае фінансаванне.

Выяўленне генетычнай схільнасці да інфарктаў вельмі важнае, бо яно дазваляе больш дакладна вызначыць групы рызыкі. Напрыклад, у чалавека высокі крывяны ціск, павышаны халестэрын, значыць, ён ужо трапляе ў групу рызыкі. А калі ў яго яшчэ выяўлены гэты зменены ген, рызыка інфаркту ў яго яшчэ вышэйшая. Такому пацыенту абавязкова патрэбны медыцынскі кантроль, і чалавек павінен весці адпаведны лад жыцця. Яму нельга курыць, набіраць вагу, нельга весці маларухомы лад жыцця. З улікам генетычнай схільнасці можна таксама выключыць узнікненне паўторных інфарктаў.

Цеснае супрацоўніцтва з практычнай медыцынай дае магчымасць прасачыць, наколькі нашы генетычныя звесткі супадаюць з медыцынскімі дадзенымі (цяжкасць інфарктаў, паўторнасць іх і г.д.). А ўрачам гэта распрацоўка неабходная для дыягностыкі і прафілактыкі хваробы. Ведаючы генатып чалавека, доктар бачыць, на што трэба звярнуць большую ўвагу, і можа скарэктаваць лячэнне.

Медыкі сцвярджаюць, што рызыка атрымаць «сардэчныя праблемы» істотна зніжаецца, калі рэгулярна ўжываць у ежу пэўныя прадукты. Вось так можа выглядаць «меню для сэрца».

** **ГРЭЧКА.** Яна ўтрымлівае вітаміны групы В, РР, Р, руцін, кальцый, фосфар, амінакіслоты. Пры гэтым у ёй менш вуглявадаў, чым у іншых крупах. Есці можна ў якасці гарніру, а таксама як самастойную страву — з малаком, смажанай цыбуляй і грыбамі. **Дзённая норма: 600 г.***

** **ПАМІДОРЫ.** Утрымліваюць 94 % вады, але, акрамя таго, вітаміны Е, С, РР, карацін, хром, клятчатку. Тыя, хто не любіць свежыя памідоры, могуць ужываць іх тушанымі ці ў выглядзе таматнага соку. Палавінкі памідораў, пасыпаныя духмянымі травамі, можна запякаць на грылі. **Дзённая норма: 2 штукі.***

** **ЧАСНОК.** Утрымлівае фосфар, калій, цынк, селен, вітаміны А і С, кальцый, магній, жалеза, амінакіслоты, пекцін, аліцын. Есці ў свежым выглядзе, дабаўляючы ў салаты і закускі. Часнок не рэкамендуецца ўжываць людзям, у якіх ёсць страўнікава-кішачныя захворванні. **Дзённая норма: 1—2 зубкі.***

** **БЕЛАКАЧАННАЯ КАПУСТА.** Утрымлівае аскарбінавую і тартронавую кіслоты, вітаміны групы В, РР, К, Е, U (метылметыянін), фосфар, амінакіслоты. Можна рабіць салаты са свежай капусты з цыбуляй, яблыкамі, зелянінай ці тушыць яе з морквай, перцам, памідорамі. Смажыць на масле не рэкамендуецца: гэта надта тлустая страва. **Дзённая норма: 100—300 г.***

** **МІНДАЛЬ.** Утрымлівае пратэін, вітамін B_{15}, полікіслоты. Есці ў свежым выглядзе, без дабаўкі солі, цукровай ці шакаладнай глазуры і г.д. **Дзённая норма: 70 г.***

Вольга ШАЎКО.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь извещает о проведении открытого конкурса по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций открытого акционерного общества «УПНР» (далее — ОАО «УПНР»).

Конкурс состоится 30 сентября 2008 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Продавец — Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Для участия в конкурсе в срок до 16.00 12 сентября 2008 г. по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401 предоставляются следующие документы:

заявление на участие в конкурсе по установленной форме;

юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителями физических лиц — резидентов Республики Беларусь — нотариально заверенная доверенность;

юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не более чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в конкурсе) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

представителями физических лиц — нерезидентов Республики Беларусь — легализованная в установленном порядке доверенность;

представителями юридических лиц — нерезидентов Республики Беларусь — легализованная в установленном порядке доверенность или иные легализованные в установленном порядке документы, подтверждающие полномочия представителя;

юридическими и физическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иным финансово-кредитным учреждением, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки, в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь.

При подаче документов на участие в конкурсе физические лица, представители физических и юридических лиц представляют копию паспорта или иного документа, удостоверяющего личность, и предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для заверения его копии лицом, принимающим документы.

Не допускается одновременное участие в конкурсе заинтересованных лиц: физических лиц, состоящих в родственных отношениях или браке; юридических лиц, участниками которых выступают одни и те же физические и (или) юридические лица; юридических лиц, в уставном фонде которых одно и то же юридическое или физическое лицо имеет долю в размере двадцати и более процентов; юридических лиц, одно из которых в соответствии с законодательством признается дочерним или зависимым по отношению к другому.

Для участия в конкурсе уплачивается задаток в сумме 2 491 635 000 (два миллиарда четыреста девяносто один миллион шестьсот тридцать пять тысяч) белорусских рублей на счет № 3642974000028 в филиале № 529 «Белсвязь» АСБ «Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Задаток уплачивается в срок до 20 сентября 2008 г. согласно договору о задатке, заключаемому с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь при регистрации заявления на участие в конкурсе.

30 сентября 2008 г. в 10.00 участники предоставляют в комиссию в запечатанном конверте соответствующие условиям конкурса предложения по цене акций и по выполнению условий конкурса в отношении ОАО «УПНР», а также инвестиционный проект, соответствующий условиям конкурса.

Предложения участников по цене акций, не превышающие начальную цену акций, и (или) предложения по выполнению условий конкурса, не соответствующие условиям конкурса, комиссией не рассматриваются.

Из двух и более участников, предложения по выполнению условий конкурса и инвестиционные проекты которых полностью соответствуют условиям конкурса, комиссия определяет победителем участника, предложившего наиболее высокую цену за акции. В случае равных предложений по цене акций двух и более участников, победителем конкурса признается участник, предложивший лучшие дополнительные условия.

Договор купли-продажи акций заключается с победителем конкурса в срок не позднее 20 дней с даты подписания протокола о результатах конкурса.

Участники конкурса, прошедшие заключительную регистрацию, оплачивают фактические затраты на подготовку и проведение конкурса согласно выписанному каждому счету-фактуре в течение 3 рабочих дней со дня проведения конкурса.

Победитель конкурса дополнительно оплачивает затраты на проведение рыночной оценки акций согласно счету-фактуре в течение 3 рабочих дней со дня его получения.

Получить более подробную информацию об ОАО «УПНР», условиях конкурса, ознакомиться с проспектом эмиссии и годовой бухгалтерской отчетностью акционерного общества по состоянию на 1 января 2008 г., проектом договора купли-продажи акций можно по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401.

Контактные телефоны:
Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь
(017) 284 85 62; 284 89 36.
Департамент ценовой политики Министерства экономики (017) 200 68 45, 222 67 17, 222 67 72.

№	Полное и сокращенное наименование открытого акционерного общества, его адрес	Уставный фонд, шт. акций	Номинальная стоимость акции, рублей	Доля государства в уставном фонде		Предлагается для реализации		Начальная цена		Условия конкурса в отношении ОАО «УПНР»
				кол-во акций, шт.	в % к УФ	кол-во акций, шт.	в % к УФ	акции, рублей	пакета акций, рублей	
1	Открытое акционерное общество «УПНР» (ОАО «УПНР»), г. Минск, Долгиновский тракт, 39	377 314	1 200	365 476	96,9	365 476	96,9	68 175	24 916 326 300	Внесение в течение двух лет с даты подписания договора купли-продажи акций в уставный фонд ОАО «УПНР» в виде вклада 3,25 млрд. рублей; Сохранение в течение трех лет с даты подписания договора купли-продажи акций видов деятельности, осуществляемых ОАО «УПНР», и создание дополнительно не менее 100 рабочих мест.

За ОАО «УПНР» зарегистрированы земельные участки общей площадью 0,9535 га в г. Минске

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
на право заключения договора аренды земельного участка

10 сентября 2008 г. в 11.00 в здании Гродненского районного исполнительного комитета (г. Гродно, ул. Горького, 51) состоится аукцион на право заключения договора аренды земельного участка.

Лот №:	Кадастровый номер и адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Срок аренды	Начальная цена предмета аукциона, белорусских рублей	Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, белорусских рублей	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории
1	422050400002002214 г. Скидель, пересечение улиц Гагарина и Октябрьской	0,0199	для строительства торгового павильона	10 лет	1746350	1500000	вынос линии электросвязи, проходят сети газоснабжения, водоснабжения, участок прилегает к асфальтированному подъездному пути
2	422080417101000066 д. Тричи, Гродненский район, Подлабенский с/с	0,7390	для строительства производственной базы	51 год	50776560	2000000	проходят сети водоснабжения и электроэнергии
3	422084500001000021 д. Коптёвка, Гродненский район, Коптёвский с/с	0,9860	для строительства автомобильной заправочной станции	51 год	38156820	2000000	участок прилегает к асфальтированному подъездному пути
4	422000000009003819 д. Привалки, Гродненский район, Гожский с/с	1,0792	для строительства базы отдыха и ресторана белорусской кухни	51 год	11055490	2000000	возмещение потерь сельхоз. производства в сумме 828600 руб.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 4 сентября 2008 г.** представляет в комиссию по организации и проведению аукциона на право заключения договора аренды земельных участков по адресу: г. Гродно, ул. Горького, 51, каб. 88, документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона;

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет Гродненского райФО № 3602514000010 в филиале 404 АСБ «Беларусбанк», код 691, назначение платежа 04002, УНН 500027345;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенную доверенность;

представитель или уполномоченное должностное лицо юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представитель или уполномоченное должностное лицо иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представитель иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельного участка осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона на право заключения договора аренды земельных участков в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны: (80152) 74 04 14, 97 40 71.

Аукцион проводится при наличии не менее 2-х участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Шаг аукциона – 10 % от предыдущей цены, называемой аукционистом. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка вносит плату за предмет аукциона и возмещает расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Договор аренды земельного участка заключается в течение 2-х рабочих дней после внесения победителем платы за предмет аукциона и возмещения им расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Победитель аукциона в двухмесячный срок после принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка обязан осуществить государственную регистрацию прав на земельный участок.

УНН 500134249

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ ВЫКАРЫСТАННІ АТМАНАЙ ЭНЕРГІІ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2008 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2008 года

(Працяг. Пачатак у нумары за 2 жніўня.)

ГЛАВА 2
ДЗЯРЖАЎНАЕ КІРАВАННЕ Ў ГАЛІНЕ ВЫКАРЫСТАННЯ АТМАНАЙ ЭНЕРГІІ. ДЗЯРЖАЎНАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ БЯСПЕКІ Ў ГАЛІНЕ ВЫКАРЫСТАННЯ ЯДЗЕРНАЙ ЭНЕРГІІ

Артыкул 4. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне выкарыстання атамнай энергіі

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь у галіне выкарыстання атамнай энергіі:

вызначае асноўныя накірункі дзяржаўнай палітыкі;

зацвярджае дзяржаўныя мэтавыя праграмы;

прымае рашэнні аб размяшчэнні, праектаванні, будаўніцтве, уводзе ў эксплуатацыю, прадаўжэнні тэрміну эксплуатацыі, абмежаванні эксплуатацыйных характарыстык і вывадзе з эксплуатацыі атамнай электрастанцыі або яе блока;

вызначае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання або іншую дзяржаўную арганізацыю, у распараджэнні якіх знаходзіцца ядзерная ўстаноўка і (або) пункт захоўвання (за выключэннем атамнай электрастанцыі);

вызначае парадак абмеркавання пытанняў у гэтай галіне з удзелам грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый і грамадзян;

забяспечвае кампенсацыю шкоды, нанесенай шкодным уздзеянням іанізуючага выпраменьвання або дзейнасцю па выкарыстанні атамнай энергіі, у адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства;

вызначае ўмовы і парадак забеспячэння фізічнай абароны аб'ектаў выкарыстання ядзернай энергіі;

вызначае парадак ажыццяўлення дзяржаўнага нагляду за забеспячэннем фізічнай абароны аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі;

прымае меры па забеспячэнні выканання міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь у гэтай галіне;

каардынуе міжнароднае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам, іншымі законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 6. Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і іншыя дзяржаўныя арганізацыі ў галіне выкарыстання атамнай энергіі і іх паўнамоцтвы

Дзяржаўнае кіраванне ў галіне выкарыстання атамнай энергіі ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства ажыццяўляюць Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, а таксама іншыя рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, упаўнаважаныя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь у галіне выкарыстання атамнай энергіі ў межах сваёй кампетэнцыі:

удзельнічае ў фарміраванні і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі;

забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай навукова-тэхнічнай і інвестыцыйнай палітыкі;

ажыццяўляе падрыхтоўку прапаноў аб забеспячэнні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, у тым ліку па ўрэгуляванні пытанняў забеспячэння ядзерных установак ядзерным палівам;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь у галіне выкарыстання атамнай энергіі ў межах сваёй кампетэнцыі:

арганізуе гатоўнасць сіл і сродкаў органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях да дзеянняў пры ўзнікненні надзвычайных сітуацый пры выкарыстанні атамнай энергіі, а таксама дзяржаўны кантроль за выкананнем мерапрыемстваў па іх прадухіленні;

арганізуе распрацоўку знешняга аварыйнага плана;

устанаўлівае патрабаванні па забеспячэнні ядзернай і радыяцыйнай бяспекі пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі;

арганізуе мерапрыемствы па ліквідацыі, абмежаванні або зніжэнні наступстваў радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Іншыя дзяржаўныя органы ў межах сваёй кампетэнцыі:

удзельнічаюць у дзейнасці па падрыхтоўцы спецыялістаў;

ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 7. Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, якія ажыццяўляюць дзяржаўнае рэгуляванне дзейнасці па забеспячэнні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (далей — дзяржаўныя органы па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі) з'яўляюцца ўпаўнаважанымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, якія ажыццяўляюць дзяржаўнае рэгуляванне дзейнасці па забеспячэнні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь у межах сваёй кампетэнцыі:

ажыццяўляе дзяржаўны нагляд у галіне забеспячэння ядзернай і радыяцыйнай бяспекі, а таксама за забеспячэннем фізічнай абароны аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі;

арганізуе і ажыццяўляе дзяржаўны нагляд за абыходжаннем з адпрацаваўшымі ядзернымі матэрыяламі і эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі;

ажыццяўляе кантроль за выкананнем заканадаўства ў галіне забеспячэння ядзернай і радыяцыйнай бяспекі;

удзельнічае ў арганізацыі і правядзенні работ па ацэнцы адпаведнасці абсталявання, вырабаў і тэхналогій для аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі;

забяспечвае функцыянаванне адзінай дзяржаўнай сістэмы ўліку і кантролю крыніц іанізуючага выпраменьвання і дзяржаўнай сістэмы ўліку і кантролю ядзерных матэрыялаў Рэспублікі Беларусь;

арганізуе правядзенне эксперты зы бяспекі ядзернай устаноўкі і (або) пункта захоўвання, а таксама іх праектаў, у тым ліку з прыцягненнем незалежных экспертаў;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Іншыя дзяржаўныя органы па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі ў межах сваёй кампетэнцыі:

ажыццяўляюць кантроль за забеспячэннем фізічнай абароны аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі;

узгадняюць праграмы ўводу ў эксплуатацыю і вывад з эксплуатацыі ядзернай устаноўкі і (або) пункта захоўвання;

удзельнічаюць у распрацоўцы і рэалізацыі знешняга аварыйнага плана;

узгадняюць тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты ў галіне выкарыстання атамнай энергіі;

ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

Дзяржаўныя органы па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі ў частцы ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў, звязаных з дзяржаўным рэгуляваннем бяспекі, правядзенне кантролю і дзяржаўнага нагляду за дзейнасцю па выкарыстанні атамнай энергіі, з'яўляюцца незалежнымі ад рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, якія ажыццяўляюць дзяржаўнае кіраванне ў галіне выкарыстання атамнай энергіі.

(Працяг будзе.)

«Круглы стол «Звязды»

ТВАРАМ ДА ЦЭНТРА

Рушыць краіна пры вяртанні сталіцы гістарычнага аблічча

2. Зона спатыкнення

Фота Валеры КУДРАКОВА.

Папруга: Гістарычныя аб'екты цэнтра Мінска ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны. Перад планаваннем любой горадабудаўнічай актыўнасці на тэрыторыі помніка павінны быць зацверджаны адпаведныя ахоўныя зоны — як Гістарычнага цэнтра, так і яго асобных аб'ектаў. Што такое «ахоўная зона», у савецкім заканадаўстве было прапісана ад «а» да «я». У расійскім заканадаўстве ўсё гэта ёсць і дагэтуль. Тая самая распрацоўшчыца праекта Дэталёвага плана з 2000 па 2001 год падрыхтавала комплексны праект ахоўных зонаў Мінска. Нягледзячы на тое, што гэты праект быў разгледжаны і ўхвалены, ён так і не быў зацверджаны Мінгарвыканкамам...Чаму?

Бубноўскі: Саюзная інструкцыя пра ахоўныя зоны — гэта прыкладна старонак пяць дэкларатыўнага тэксту. Беларускае заканадаўства намнога больш канкрэтнае. Пры гэтым страт па сутнасці не дапушчана.

Астаповіч: Само разуменне ахоўных зонаў у нас трактуецца адвольна. Па гісторыка-культурнай каштоўнасці «Гістарычны цэнтр Мінска» ахоўных зонаў няма, няма іх і па асобных аб'ектах на гэтай тэрыторыі. Адпаведна, усе віды прац, што там праводзяцца — незаконныя. У пацвярджэнне сваіх слоў буду спасылацца на Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» ад 09 студзеня 2006 года: «Рэжымамі ўтрымання і выкарыстання зонаў аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў прадугледжваюцца абмежаванне або поўная забарона дзейнасці, якая стварае пагрозу захаванню нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў (іх навакольнаму асяроддзю) і ўмовам іх утрымання і выкарыстання».

Папруга: Комплексныя навуковыя даследаванні, навуковая фіксацыя захаванага і наступны зацвярджаны праект ахоўных зонаў — гэта першае, з чаго пачынаецца нават думка ў накірунку якога б там ні было аднаўлення. Закон аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны прапісае, што нават у дачыненні да ахоўных зонаў не можа весціся новага будаўніцтва — мы ж праводзім новыя аб'екты на тэрыторыі саміх помнікаў. Што такое пасля гэтага «ахоўная зона» ці тэрыторыя рэгулюемай забудовы? Кожны з помнікаў патрабуе выканання поўнай працэдуры пры вядзенні горадабудаўнічай дзейнасці: правядзення комплексных навуковых даследаванняў, зацвярджання ахоўных зонаў, падрыхтоўкі гістарычнага апорнага плана як асновы для далейшых работ. Дзе ўсё гэта? А мы ўжо капаем, вывозім культурны пласт, будуем. Нават без належнага вывучэння і незабяспечанай фіксацыі. Нарматыўна-прававая база карэктуецца пад патрэбы аб'ектаў, якія знаходзяцца ў стадыі зацвярджання.

Што ахоўвае дзяржаўны спіс? Чатыры катэгорыі паняццяў: гістарычная планіровачная структура, будынкі і збудаванні, ландшафт і культурны пласт. Пытанне, у якім аб'ёме ў нашым сённяшнім гістарычным цэнтры аднаўляюць адно, другое ці трэцяе, ніхто з удзельнікаў працэсу нават сабе не ставіць.

Жых: Вы кажаце, што няма ахоўных зонаў — а я кажу, што яны ёсць. Яны прапісаны і ў дэталёвым плане і ў ахоўных абавязках кожнага помніка, тэрыторыі. Не ў нашых інтарэсах і не ў інтарэсах горада прычыняць страты. Метадалагічныя асновы выконваюцца. Спачатку робіцца комплекснае навуковае даследаванне з прадстаўленнем гістарычнай даведкі па кожным з аб'ектаў, пры неабходнасці ідзе археалагічны вышук, вырашаецца, у што можна будынак ператварыць сёння і толькі пасля гэтага робіцца заданне на распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі. Вы маеце рацыю, што праект дэталёвага плана ў межах гістарычнага цэнтра нельга было рабіць толькі па вядомых тэрыторыях. У нас ёсць панясце страчаных забудоў, па якіх немагчыма было ў свой час прыняць адназначныя рашэнні, неабходна было правесці больш грунтоўнае даследаванне, і цяпер вядзецца распрацоўка праектаў рэгенерацыі забудоў. Гэта датычыцца страчаных забудоў у Ракаўскім і ў Лаўскім прадмесцях, у Верхнім горадзе, на Замчышчы. Па вуліцы Гандлёвай мы скончылі этап археалагічных вышукаў і зараз вядзём будаўніцтва магістральных інжынерных сетак. Навуковае аўтарскае і археалагічнае суправаджэнне вядзецца па кожным аб'екце. Але і пры гэтым бываюць сюрпрызы, як, напрыклад, здарылася ў адным з будынкаў па Камсамольскай, дзе адкрыўся фрагмент фрэскавага жывапісу, які зараз будзе аднаўляцца. І ні цяперашнія метадалогіі, ні ўзровень нашых даследаванняў не выявілі спачатку ўсе асаблівасці гэтага помніка. Але для гэтага і ёсць абгрунтаванае кіраўніцтва працамі, каб аператыўна прымаць рашэнні ў працэсе рэстаўрацыі. А калі ўзнікаюць пытанні наконт вывезенага грунту з будынкаў вуліцы Рэвалюцыйнай, то кожны фрагмент, знойдзены ў працэсе археалагічных абследаванняў, падлягае абмерам, фотафіксацыі і справаздачы.

Папруга: Калі б рабіся комплексныя навуковыя даследаванні, то, безумоўна, быў бы знойдзены той цалкам распісаны сценавым роспісам пакой, у якім, дарэчы, рабіўся Праект дэталёвага плана. Хто адкрыў тую фрэску? Рабочыя, якія білі электрычную штрабу. Дык гэта яшчэ не самы горшы прыклад — гэты помнік зносілі толькі больш чым напалову, між іншым, разам з найдаўжэйшай з распісаных сцен. А што адбылося з Рэвалюцыйнай, 17? Шмат гадоў помнік рамантаваўся, а пасля таго, як быў накрыты разабраны дах і ўмантаваная новая сталярка, быў знішчаны дашчэнту. Там жа на рагу раней стаяла мураваная гістарычная камяніца. Ці ёсць абмер яе падмуркаў, на месцы якіх ужо адліты бетонны пяціметровай глыбіні катлаван? А калі казаць пра Гандлёвую, то археолагі там і не працавалі — іх пусцілі «ў двары» ўжо пасля таго, як праклалі калектар.

Жых: У нас ёсць нарматыўныя тэрміны, згодна з якімі калектар будзе пракладзены. А ёсць і шматлікія выпадкі даследаванняў вуліцы Гандлёвай — археалагічныя знаходкі. Найбольш цікавыя з іх — цэгла з падмуркаў, якая некалі была вывезеная з прадмесцяў Варшавы, шкло, посуд, ганчарныя вырабы, некаторыя элементы збруі, манеты. Ці вось, напрыклад, комплекс будынкаў па вуліцы Кірылы і Мяфодзія, 6-8, цікавы квартал у Верхнім горадзе, які стварае чатыры вулачкі. Будынкі за сваю гісторыю перажылі 4 пажары, у царскі час — дзве вялікія рэканструкцыі. І падчас другога этапа археалагічных даследаванняў тут прыходзілася капаць на глыбіню 2,5-3 метры. Ніхто і не спадзяваўся, што на гэтым невялічкім пятачку гістарычнай зямлі мы з дапамогай супрацоўнікаў Інстытута гісторыі Акадэміі навук выявім цікавыя сведчанні старажытнасці частачкі горада, які складаўся з Верхняга і Ніжняга горада, Замчышча ў XII стагоддзі. А што датычыцца страчанага будынка на рагу вуліц Рэвалюцыйная і Гарадскі Вал, то абмер гэтай забудовы зроблены, і помнік будзе адноўлены.

«Круглы стол» правяла Ларыса ЦІМОШЫК.

Працяг. Пачатак у нумары за 2 жніўня.

Уважаемые акционеры ОАО «Технобанк»!

Настоящим уведомляем о принятии внеочередным Общим собранием акционеров ОАО «Технобанк», проведенным в очной форме 24 июля 2008 года (протокол № 4), решения о внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Технобанк», и о Вашем праве требовать выкуп акций, если это явилось следствием ограничения прав акционеров.

Подача акционерами ОАО «Технобанк» заявлений с требованиями о выкупе акций осуществляется в ОАО «Технобанк» в течение 20 рабочих дней с даты проведения Общего собрания акционеров (24.07.08). Требования о выкупе акций (либо уведомление об отказе от выкупа) удовлетворяются ОАО «Технобанк» в течение 30 рабочих дней с даты подачи заявления с требованием о выкупе акций.

Для получения дополнительной информации предлагаем обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон 017 237 43 80.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г. УНП 100706562

У КРАДЗЕЖ УЦЯГНУЛІ І ШКОЛЬНІКА

Два хлопцы з Мазыра і Калінкавічаў, якія нідзе не працуюць, ноччу прыйшлі на тэрыторыю мехдвара КСУП «Прудкоўскае», што ў Калінкавіцкім раёне, і зрабілі «рэвізію» дызельнага паліва ў трактарах гаспадаркі. У тым сэнсе, што злілі яго ажно 332 літры.

У гэты занятак зламыснікі ўцягнулі вучня Юравіцкай сярэдняй школы, за што ім дадаткова давядзецца адказваць. Цікава, што ў штаце мехдвара ёсць пасада вартаўніка. А дзе ён быў у час крадзяжу, ніхто, акрамя яго, не ведае.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

«Штучнае» апладненне па паказаннях

Чуткі аб тым, што некаторыя сем'і прыбягаюць для экстракарпаральнага апладнення з мэтай набыцця статусу шматдзетнай і вырашэння такім чынам жыллёвага пытання, мякка кажучы, перабольшаны.

У гэтым пераканана галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Святлана ШЫЛАВА. Паводле яе слоў, экстракарпаральнае апладненне — адзін з метадаў вырашэння праблемы бясплоднасці пар (а такіх, паводле афіцыйных даных, звыш 9 тысяч) — мае свае паказанні і проціпаказанні. Нягледзячы на тое, гаворка ідзе аб платнай і досыць дарагой працэдуры (яе агульны кошт у РНПЦ «Маці і дзіця» складае ад 3 да 5 мільёнаў рублёў), гэта не той выпадак, калі можна прызначаць яе сабе самой.

Як вядома, існуе цэлы «арсенал» метадаў павышэння фертыльнасці і выдаленне прычыны бясплоднасці ў мужчын і жанчын. Пар, якім патрабуецца менавіта штучнае экстракарпаральнае апладненне, калі надыход цяжарнасці натуральным шляхам не ўяўляецца магчымым, не так і шмат. Тым не менш даслёка не ўсім бясплодным жанчынам можа быць паказана падобнае ўмяшальніцтва, адзначае загадчык аддзялення планавання сям'і і дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Ала КАМЛЮК. Акрамя таго, варта мець на ўвазе, што з сотні вышэйпамянёных апладненняў на свет могуць з'явіцца не больш як 30-40 дзяцей. Грошы ў выпадку няўдачы кліентам, зразумела, не вяртаюцца. У РНПЦ «Маці і дзіця» каля 40 жанчын выношваюць на сёння экстракарпаральную цяжарнасць.

Цяпер працэдуру экстракарпаральнага апладнення выконваюць у Беларусі чатыры медыцынскія цэнтры: тры ў Мінску і адзін у Гомелі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

2 сентября 2008 года в 14.00
состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белторгстрой» по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 8, зал коллегии.

Регистрация с 13.00. При себе иметь паспорт.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет Ревизионной комиссии.
2. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2007 год.
3. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2007 год.
4. Об утверждении направлений использования чистой прибыли на 2008 год и первый квартал 2009 года.
5. Выборы членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. Утверждение размера материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. О передаче части полномочий общего собрания акционеров Наблюдательному совету Общества.

УНН 100633428

У МІНСКУ РАСЦЕ КОЛЬКАСЦЬ ДОЎГАЖЫХАРОЎ

Стогадовы рубеж пераступілі 55 мінчан — 7 мужчын і 48 жанчын, гэта на 5 чалавек больш, чым было ў пачатку года. Тром жыхарам споўнілася больш за 110 гадоў, расказала галоўны спецыяліст Камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама Аксана Падарожная. Самая старэйшая жыхарка Мінска — Клаўдзія Аляксееўна Якімовіч. 20 жніўня ёй споўніцца 114 гадоў. А з мужчын самы пажылы — Сяргей Васільевіч Лобазаў. 1 ліпеня ён адзначыў 106-ы дзень нараджэння.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2008 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2008 года

(Працяг. Пачатак у нумары за 2 жніўня.)

Артыкул 9. Тэрмін паўнамоцтваў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь дзейнічае на працягу тэрміну паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і складае свае паўнамоцтвы перад зноў выбраным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, калі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у выпадках і парадку, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, не прынята рашэнне аб адстаўцы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прымае пастанову аб складанні паўнамоцтваў.

У выпадку складання паўнамоцтваў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь працягвае ажыццяўляць свае паўнамоцтвы да сфарміравання новага Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 10. Адстаўка Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у поўным складзе, Прэм'ер-міністр, кожны член Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь асобна маюць права заявіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь аб сваёй адстаўцы, калі палічаць немагчымым выконваць усклады неныя на іх абавязкі. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь заяўляе Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь аб сваёй адстаўцы і прымае пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб адстаўцы.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь заяўляе Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь аб сваёй адстаўцы і ў выпадку выказвання Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь вотуму недаверу Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь мае права па ўласнай ініцыятыве прыняць рашэнне аб адстаўцы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і вызваліць ад пасады любога члена Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Адстаўка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь не цягне за сабой складання паўнамоцтваў Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у поўным складзе.

У выпадку адстаўкі Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь працягвае ажыццяўляць свае паўнамоцтвы да сфарміравання новага Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 3
КАМПЕТЭНЦЫЯ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Артыкул 11. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у эканамічнай сферы

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у эканамічнай сферы:

забяспечвае правядзенне адзінай эканамічнай палітыкі;

рэгулюе дзейнасць усіх галінаў эканомікі Рэспублікі Беларусь і прымае меры па іх развіцці;

ажыццяўляе інвестыцыйную дзейнасць з улікам прыярытэтных накірункаў сацыяльнага і эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь;

забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі, у тым ліку ў галіне выкарыстання і эканоміі энергетычных і матэрыяльных рэсурсаў;

прымае меры па забеспячэнні Рэспублікі Беларусь энергетычнымі і матэрыяльнымі рэсурсамі;

устанаўлівае меры дзяржаўнага рэгулявання асобных відаў эканамічнай дзейнасці;

забяспечвае распрацоўку і рэалізацыю дзяржаўнага прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных праграм;

удасканальвае эканамічны механізм садзейнічання паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу, павышэння тэхнічнага ўзроўню і якасці прадукцыі, стварэння высокаэфектыўных, экалагічна бяспечных тэхналогій;

выступае ад імя ўласніка ў дачыненні да маёмасці, якая заходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, арганізуе кіраванне дзяржаўнай уласнасцю;

мае права ствараць, рэарганізоўваць і ліквідаваць рэспубліканскія юрыдычныя асобы;

садзейнічае інтэграцыі эканомікі Рэспублікі Беларусь і эканомікі іншых дзяржаў з улікам інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, уносіць адпаведныя прапановы Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўляе дзяржаўнае рэгуляванне знешнегандлёвай дзейнасці, распрацоўку праграм развіцця знешнегандлёвай дзейнасці;

забяспечвае процідзеянне манапалістычнай дзейнасці і развіццё добрасумленнай канкурэнцыі;

праводзіць дзяржаўную палітыку ў галіне абароны правоў спажыўцоў;

забяспечвае эканамічную самастойнасць Рэспублікі Беларусь.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у эканамічнай сферы акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 12. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у фінансавай сферы

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у фінансавай сферы:

забяспечвае правядзенне адзінай фінансавай палітыкі;

штогод распрацоўвае і прадстаўляе Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь для ўнясення ў Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь праект бюджэту Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і справаздачу аб яго выкананні;

ажыццяўляе рэгуляванне ўнутранага і знешняга дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь;

забяспечвае прыцягненне, выкарыстанне і пагашэнне знешніх дзяржаўных пазык (крэдытаў), якія фарміруюць знешні дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь;

выступае ад імя Рэспублікі Беларусь пры прадастаўленні дзяржаўных гарантый Рэспублікі Беларусь;

вызначае меры па забеспячэнні збалансаванасці грашовых даходаў і расходаў насельніцтва, паляпшэнні фінансавага стану галінаў эканомікі і выкарыстанні крэдытных рэсурсаў.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у фінансавай сферы акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

(Працяг будзе.)

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»
10 сентября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, проводит аукцион по продаже объекта, находящегося в собственности Узденского района, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для обслуживания недвижимого имущества

На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий:

Здание химчистки-прачечной-котельной (инв. № 623/С-7851), расположенное по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. К. Маркса, 35, 1977 года постройки, общей площадью 475,8 кв.м, одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки – кирпичные, перекрытия железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная, полы – плитка, дощатые, имеется центральное отопление, водопровод, горячее водоснабжение, канализация, электроосвещение и **право заключения договора аренды земельного участка** площадью 0,1185 га, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, сроком на 99 лет.

Начальная цена предмета аукциона 560 934 586 рублей (в том числе: недвижимое имущество – 555 470 255 рублей и право заключения договора аренды земельного участка – 5 464 331 рубль).

Сумма задатка предмета аукциона 30 000 000 рублей.

Продавец имущества: Коммунальное унитарное предприятие «Узденский районный комбинат бытового обслуживания», расположенный по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, пл. Свободы, 2, тел (801718) 55667.

Арендодатель земельного участка: Узденский районный исполнительный комитет.

Земельный участок отведен для обслуживания здания.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка для участия в аукционе на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Узденским райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Все расчеты по сумме задатка производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09
Последний день подачи заявок 8 сентября 2008 г. до 17.00.

УНП 600119335

Пряльницкий сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот 1 — земельный участок в деревне Падневичи, площадь участка — 0,2470 га, начальная цена 4 000 000 белорусских рублей;

Лот 2 — земельный участок в деревне Падневичи, площадь участка — 0,2498 га, начальная цена 4 000 000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома.

Земельные участки расположены на берегу реки Ислочь. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненных к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены и сбор за участие в аукционе в размере четырех базовых величин перечисляется двумя квитанциями в Главное управление МФ РБ по Минской области РБ, р/с 3600614130162 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600059273, назначение платежа 04901. **Аукцион состоится 5 сентября 2008 года в 11.00 по адресу: деревня Пряльники

ТРОШКІ СОНЦА Ў ХАЛОДНАЙ ВАДЗЕ

Дзённік бландзінкі

На індыйскай выставе пабачыла плакат «Колератэрапія». Сапраўды, гэта працуе! Заходзіш у выставачны павільён і быццам бы сягнуў за тысячу кіламетраў, такая тут цёплая атмасфера! Вока радуецца, хоць насіць усё гэта, як на мой еўрапейскі густ, у нашым шэрым-шэрым горадзе складана...

Чым я дакладна не захапляюся, дык гэта індыйскімі танцамі — часу няма. Але цётухна-танцорка, якая заўсёды бывае на гэтым кірмашы, была такая какетлівая, так міла ўдавала бо-

язь, становячыся на шаблі, скокучы ў медным тазіку і падскокваючы на бітым шкле, што гледачы пранікліся яе радасцю і сталі падтанцоўваць пад бомканне барабану.

А яшчэ мяне купілі прадаўцы. Гаворыш з імі і адчуваеш сябе такой прыгожай-прыгожай і багатай-багатай. Асабліва пасля таго, як табе прапануюць шаль за семсот пяцьдзесят баксаў! На такі нават глядзець боязна, не тое што ў руках трымаць. І вераць жа яны, што беларускі могуць сабе дазволіць такую раскошу... Зрабіла індусу камплімент — ну трэба ж, па-руску і без акцэнта. На што ён адказаў: «Дык я і па-беларуску магу, калі трэба...» Ну калі б мне трэба было прадаць шаль за такую суму, можа і я б на якім хіндзі загаварыла... Не, напэўна, не... Але вось што цікава... Бачыла я ўжо і немцаў, якія вольна гавораць па-нашаму, і шведаў, і італьянцаў. Вось ужо і індусы гатовыя далучыцца. Справа за беларусамі.

НЕ РАДЗІСЯ ПРЫГОЖАЙ

Цяпер, калі я сапраўды дарослая і магу з вышыні ўзросту сведчыць, што прыказка «Не радзіся прыгожай, нарадзіся шчаслівай» мае права на існаванне, бо пацверджана маімі ўласнымі назіраннямі, я ўсё яшчэ думаю над ёй.

Я ніяк не магу адказаць на пытанне: няшчасці, якія сыплюцца на галаву прыгожых, сапраўды большыя, чым тыя, што сыплюцца на непрыгожыя галовы, ці проста гэтыя няшчасці ўспрымаюцца больш яркa на кантрасце са шчасцем нарадзіцца прыгожай?

ПРА ХАДЖЭННЕ Ў МАНАСТЫР СА СВАІМ СТАТУТАМ

Так бывае — нешта здаецца табе відавочным, відавочным настолькі, што галаву гатовы аддаць на адсячэнне... А другі чалавек глядзіць на цябе — толькі дзівіцца. Асабліва часта так здараецца, калі вы людзі розных культур, прычым веды пра чужыя звычаі пачэрпнулі з кніг бы клуба падарожнікаў.

Напрыклад, я заўсёды была ўпэўненая ў тым, што шведкі без комплексаў. У сэнсе не замарочваюцца на тым, як выглядаюць. Але аднойчы выпадкова стала сведкай забаўнай сцэны. На кніжным кірмашы ў Гётэборгу стаяла аграмадная чарга ў жаночую прыбіральню. Не ведаю чаму — так склалася гістарычна... А побач у мужчынскую — нікога. Нейкая цётка ў мужчынскую забегла, зрабіла тое, што ёй трэба, выбегла задаволеная і давай крайнім у жаночай чарзе тлумачыць па-ангельску, маўляў, вольна, не таміцеся... Як жа абурыліся шведкі! Я мовы не ведаю, але сэнс быў абсалютна адназначны, эквівалентны «панаехалі тут...» І ніхто з фемінізаваных шведак туды не пайшоў.

Але яшчэ больш мяне здзівіла шведка, дэпутат бундэстага (ці як там называецца месца, дзе прымаюцца законы?), якая сказала, што яна ў складзе камісіі, якая працуе над праектам закона, згодна з ім усе прастытуткі аўтаматычна павінны атрымліваць грамадзянства Швецыі. Я вушам сваім не паверыла! Нават спыталася — ці разумее яна, што гэта прывядзе да таго, што жанчыны з усяго свету будуць з'язджацца да іх, каб заняцца прастытуцыяй? І што нават людзі, не схільныя да такога роду дзейнасці, пойдуць на гэта дзеля грамадзянства?

На што мне вельмі ветліва патлумачылі, што я не разумею, што такое быць прастытуткай у Швецыі... Мякка кажучы, я была ўпэўненая, што цётка не ў сваім розуме. Але пасля Дзіма Плакс, беларус, які там жыве, пацвердзіў мне яе словы, растлумачыўшы прыкладна так — норавы ў краіне вельмі свабодныя, сэкс не з'яўляецца дзівам нават паміж зусім малазнаёмымі людзьмі. І калі ўжо чалавек не хоча займацца гэтым з суседкай, каханкай, калегай па працы — якія сто адсоткаў яму не адмовяць — значыць ён рэдкі вычварэнец, а прастытутка ў такім разе — ахвяра вычварэнца... І як ахвяра мае права на льготы... З яго тлумачэнняў зразумела, што логіка ў гэтым праекце ёсць, проста я яе не бачу па прычыне неабазнанасці ў глыбіні праблемы. Ну, ну... Цікава, ці прымуць яны такі закон...

РАРЫТЭТ

Я часта ўздыхаю — о, часы! о, норавы!

І гэты ўздых адрасаваны ў першую чаргу полава-фліртавым ўзаемаадносінам. Не магу прызвычаіцца да змены роляў... Адкрыла раніцай «Камсамолку» — а там цэлая школа, як дзяўчыне пазнаёміцца з мужчынам. Парада прымітыўная... Ідзіце ў супермаркет і чапляйцеся да мужыкоў, прапаноўваючы свае паслугі ў выбары тавару.

Уявілася:

— Мужчына, не бярыце цялячую выразку! Лепш бычыныя яечкі. І танна, і патэнцыю павышаюць...

Мужчына адразу зразумее, што вы ідэальная жонка — сэксуальна-эканамічная.

Тое раніцай... А вечарам пайшла ў «Карону». І ўспомніла прачытанае, калі мужычок перада мной у аптэчнай чарзе стаў прасіць карвалол і «алкозельцер», вінавата косячыся ў мой бок. Ну-ну, думаю, вось і ўсе камсамольскія парады... Паіранізавала, каравцей, пайшла на касу.

І тут высветлілася, што не адна я тую газету чытала! Хлопец, які стаяў за мной у чарзе, спачатку доўгім поглядам зазірнуў мне ў вочы. А пасля нахіліўся і стаў разглядаць выкладзеныя з карзінкі на касавую ленту пакупкі. А там нічога цікавага! А чарга падыходзіць, часу не застаецца і ён быццам бы сам сабе гаворыць:

— Гэта што? — і чытае: «Бульба!»

Паварочваецца да мяне і гаворыць: «Ніколі ў жыцці не бачыў такой бульбы».

Я слова не змагла сказаць — так смяялася. З другога боку — хораша, што засталіся яшчэ мужчыны, якія не баяцца загаварыць з жанчынамі першымі.

ДЗІКІ ГОЛУБ

Выставіла здымак на фотасайце, і мне напісалі, што на здымку не проста дзікі голуб, а вяхір альбо віцюень, самы асцярожны голуб нашых лясоў. Натуральна, не ведала! Смешна, але паўлінаў мне даводзілася бачыць неаднойчы, а вось «вяхір» у мяне першы.... Нават не ведаю, як ён дакладна называецца па-беларуску. Падазраю, што наступнае пакаленне гараджан наогул не будзе дзяліць галубоў на горліц, віцюеньяў і хатніх... Усе яны будуць абстрактнымі — «птушкамі». Сумна....

СУНІЦЫ І МОГІЛЬНІК

Збіраю суніцы... Чырвоныя, салодкія, буйныя. Датыкнешся да ягады — сама ў руку скатваецца. Як не ўспомніць цвятаеўскае «Кладбищенской земляники крупнее и слаще нет...»? Толькі ж хто з сучаснікаў пойдзе на могілкі па суніцы? І тут — сюрпрыз! Калі Магамет не ідзе да гары, то горка ідзе да Магамета. Аказалася, што суніцы растуць не проста сабе на пагорку, а на кургане XI—XII стагоддзя... Вось і шыльда стаіць. І ўсё гэта каля бадай самага вядомага дачнага пасёлка.

Набрала ягад, іду па лесе, вядзерцам матляю. Тут бабулька мяне даганяе і пытае так строга, як на іспыце: «А што ты з імі будзеш рабіць?» «З марозівам есці...» «Не», — кажа, — правільна — гэта калі есці іх з малаком і цукрам...»

Вось так заўсёды, для кожнага пакалення свае густы. Пакаленне маіх бацькоў лічыла, што няма нічога смачнейшага за цукеркі «падушачка». Няўжо і я калі-небудзь буду расказваць, што самым карысным і смачным з'яўляецца які-небудзь «Марс-Снікерс»?

Ганна КІСЛІЦЫНА.

УРАЖАНЫЯ ФОЛКАМ

Ведай нашых!

Усе ведаюць пра гучны конкурс «Еўрабачанне», які заснаваў Еўрапейскі вяшчальны саюз. Але ўжо 29 гадоў гэтая арганізацыя праводзіць штогод буйны Міжнародны фальклорны фестываль, не менш цікавы і значны для музыкі. Іншая рэч, што вакол яго няма штучнай шуміхі — сапраўдная старадаўняя музыка пазбегла розных танных упрыгожанняў, якія дыктуе час. Цяпер зразумела, пра што гаварыць: часу непадуладныя сапраўдныя каштоўнасці.

Адметна, што Еўрапейскі вяшчальны Саюз ужо сёлета, за год да памянёнага «Еўрабачання», прыйшоў у Расію з вялікім фестывалем. І сімвалічна — з фестывалем спрадвечнай музыкі розных краін. Расія яго прымала ўпершыню. Але падрыхтавалася: арганізатарамі з расійскага боку выступілі Усерасійская дзяржаўная тэлерадыёкампанія і яе філіялы — «Радыё Расіі» і «Маяк».

Беларускія артысты выступалі на гэтым фестывалі другі раз. Першай была наша славутая «Тройца». Яе прадставіла «Белтэлерадыёкампанія», якая з'яўляецца членам Еўрапейскага вяшчальнага саюза. Так для многіх слухачоў у Еўропе адбылося адкрыццё фальклорнай музыкі Беларусі. Але сёлета да іх даделіся расіяне: іх пакарыла спявачка Наталля Матыліцкая, якая выступала пад акампанементам старадаўняй дуды — выдатна валодае гэтым інструментам Алег Лук'янцаў.

Прадзюсар і знаўца фальклору Таццяна Песнякевіч вырашыла, хто паедзе на сёлетні фестываль у Маскву, калі паслухала альбом Наталлі Матыліцкай «Пчолачка». Таму што лепшае, што можа паказаць Беларусь у музыцы — гэта менавіта свой аўтэнтычны фальклор, які пакуль яшчэ захаваўся. А ў многіх краінах свету ўжо даволі актуальная праблема захавання і развіцця народнай музыкі, і сёлета ў рамках фестывалю ішла пра гэта гаворка на сустрэчы прадзюсараў.

Кожнаму было што сказаць. А ў Беларусі ўзнікла магчымасць нават паказаць на прыкладзе, як гэта можна рабіць.

— Я прыхільніца аўтэнтычнай стылістыкі, — гаворыць Наталля Матыліцкая. — Мяне засмучае, калі ў сучасных гуртах, якія працуюць у фолк-мадэрне, зусім не пазнаецца фальклор. У некаторых еўрапейскіх краінах няма фальклорнай даўніны, няма першасных узораў, так, як у нас. Касмапалітызм, з аднаго боку, яднае народы, але пры гэтым ёсць небяспека страціць менавіта нацыянальную аўтэнтыку. Такая тэндэнцыя ўжо адчуваецца нават у народнай музыцы. Таму цікавасць да «чыстай этнікі» сёння асабліва.

Наталля магла заўважыць гэта па ўсёй праграме фестывалю, на які, акрамя беларусаў, прыехалі ўдзельнікі з Расіі, Украіны, Фінляндыі, Чэхіі, Польшчы, Бельгіі, Германіі, Ірландыі, Нарвегіі, Іспаніі, Харватыі, са Славеніі, Швецыі і Швейцарыі. У Расіі ўсё было арганізавана з размахам: прыём удзельнікаў у мэрыі Лужкова, урачыстае адкрыццё ў Вялікім палацы Казакова ў Царыцына, самі канцэрты — на тэрыторыі музея-запаведніка ў Царыцына. Спецыяльна была зроблена сцэнічная пляцоўка пад адкрытым небам, а гледачы ўладкоўваліся перад ёй на траве — как сапраўды адчувалася блізкасць да народнай культуры. Кожны з удзельнікаў мог паказаць сваю сольную праграму. Жанры, у якіх працуюць музыканты, розныя — ад чыстага фолку да этнапопу, этнаджазу і нават этнароку. Расія была прэзентавана аж трыма калектывамі. Але «чыстую этніку» прывезла толькі Беларусь, якая прымусіла слухачоў зразумець, што фальклор — гэта высокае мастацтва, а не часовае задавальненне. За гэта нашых артыстаў узнагародзілі асаблівай увагай, а шматлікія расійскія радыёстанцыі ледзь не разрывалі беларускую спявачку на часткі, запрашаючы на інтэрв'ю.

— У расіян ёсць цікавасць да «чыстай этнікі», — працягвае Наталля. — У іх няма гэтага накірунку. Мы паказалі прыклад, як захоўваць і прапагандаваць свой фальклор. Адна з арганізатараў сказала, што Беларусь — узор у гэтым.

З Масквы беларускія ўдзельнікі прывезлі самыя добрыя ўспаміны і пажаданні. Пасля канцэрту да іх падыходзілі прадстаўнікі беларускай дыяспары. Для іх гэта была магчымасць глынуць паветра з радзімы. І запрасіць Наталлю прыязджаць з канцэртамі. Зацікавіліся музычным прадуктам, які зроблены ў Беларусі, многія іншаземцы. Напрыклад, у Берліне таксама праходзіць буйны фальклорны фестываль, дзе пакуль не чулі голасу Наталлі Матыліцкай...

Лариса ЦІМОШЫК.

ТУРНІР ДЛЯ САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН

Чацвёрты этап Кубка свету па сілавым шматбор'і «World Strongest Men» прайшоў трэцяга жніўня ў гарналыжным цэнтры «Сілічы». У спаборніцтвах узялі ўдзел 14 спартсменаў з 11 краінаў свету (Расіі, Беларусі, Латвіі, Славеніі, Польшчы, Эстоніі, Англіі, Фінляндыі, Балгарыі, Канады і ЗША).

Фота Вольгі ЛАСКІ.

Сяргей РУМІН, Беларусь.

Пераможцам стаў паляк Марыуш Пудзяноўскі — чатырохразовы чэмпіён свету. Другое месца ў чэмпіёна Расіі Эльбруса Нігматуліна, трэцяе заняў фін Яні Віртанен.

Беларускія спартсмены Сяргей Румін і Аляксандр Лапыраў на п'едэстал гонару не падняліся.

Сяргей Румін, двухразовы чэмпіён Беларусі, заняў 10-е месца. Аляксандр Лапыраў, які ўдзельнічаў замест іранскага спартсмена, не змог працягнуць спаборніцтва.

— Месяц таму я атрымаў траўму, — расказвае Аляксандр. — Адзін з пучкоў трыцэпса адарваўся, і ўтварылася гематома. Быў курс рэабілітацыі. Урачы параілі адпачыць як мінімум месяц. Але сёння вырашыў рызыкнуць і паўдзельнічаць. На жаль, атрымалася тое самае і быў вымушаны спыніцца. Прыйдзецца адпачываць да канца сезона. Не ўдаўся ён у мяне. Спадзяюся, наступны будзе лепшым.

Сяргей Румін тлумачыць сваё 10-е месца адсутнасцю ў праграме спаборніцтваў яго любімых практыкаванняў і агульнай стомленасцю:

— У спаборніцтвах удзельнічаю кожны тыдзень. Беларускі этап для мяне складваецца не вельмі, таму што тут няма маіх любімых практыкаванняў: пад'ём машыны, чамадан. Калі б яны былі, то, я думаю, было б крыху лепш. Беларускім атлетам заўсёды цяжка выступаць. Няма базы. Шоу «World Strongest Men» для мацных людзей, і застаюцца ў ім адзінкі. Таму што кожны турнір залежыць ад краіны. Арганізатары робяць, як захочуць, і мы павінны падпарадкоўвацца. Тут няма стандартаў для снарадаў. Хто што зробіў, тое і даводзіцца падымаць. Атрымоўваецца, што нават калі ў цябе дома ёсць снарады, і ты на іх рыхтуешся, не значыць, што на спаборніцтвах будзе тое самае.

Арганізатарам мерапрыемства Федэрацыя асілкаў СНД і Балтыі і тэлеканал «АНТ» прапанавалі спартсменам многія практыкаванні.

Напачатку атлеты, седзячы, цягнулі за трос двухтонны аўтамабіль на хуткасць. Пасля памераліся сіламі ў падыманні бервяна вагой 140 кг на разы. Далей асілкі праходзілі «кола Конана». Ідэя гэтага практыкавання ўзята з фільма «Конан Варвар», дзе Арнольд Шварцнегер круціў калаўрот з цяжарам. Другая назва практыкавання — «Гадзіннік». Да металічнага шоста, які свабодна паварочваецца на нерухомай аснове, прымацаваны груз вагой 350 кілаграмаў. Спартсмену неабходна падняць шост і прайсці найбольшую колькасць колаў. Пры гэтым груз нельга ставіць і цягнуць па зямлі. У практыкаванні «Шпацыр лесніка» спартсмены павінны былі аднесці як мага далей плоскую металічную скрыню з дзвюма ручкамі вагой 175 кг...

Беларусь ужо трэці год запар прымае этапы турніру «World Strongest Men». Паводле слоў Уладзіслава Рэдзькіна, старшыні кіраўніцтва Федэрацыі асілкаў СНД і Балтыі, сёлета быў самы моцны этап...

Настасся ЗАНЬКО.

Інфарм-укол

Падсапсаваны прадукт — на сметнік

Цвіль можна зразаць толькі з сыру. Нават невялічкую пляму на хлебе, варэнні, грыбах, каўбасе, апельсінах і г.д. дараваць нельга. Тэрмінова выкідвайце такі прадукт!

Бясшкодныя грыбкі — гэта толькі пеніцылы. Уся астатняя цвіль вельмі таксічная! Асабліва на малочных прадуктах, каўбасных вырабах і арэхах. Споры большасці відаў цвілі — моцныя алергены і могуць справакаваць нават прыступ астмы. Больш за тое, пры нізкім імунітэце можна падхапіць інвазіўны мікоз — цяжкае паражэнне лёгкіх.

«Дзіцячага» шчасця, як і эйфарыі ад шлюбу, хапае на два гады?

Радасць ад усведамлення таго, што вы сталі бацькамі, доўжыцца ўсяго два гады, — гэтак жа як і эйфарыя ад шлюбу, сцвярджаюць замежныя даследчыкі.

Людзі досыць хутка прывыкаюць да шлюбу і дзяцей, і не перажываюць доўгачасовых пазітыўных адчуванняў ад такіх глабальных падзей у жыцці кожнага чалавека. Проста людзям уласціва вяртацца да станоўчых эмоцый да «базавага» стану.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Хваробы сістэмы кровазвароту займаюць першае месца сярод прычын смерці жыхароў сталіцы

Ад хваробаў сістэмы кровазвароту ў першым паўгоддзі гэтага года памерлі 4694 мінчаніны, або 53,6 працэнта ад агульнай колькасці памерлых. Аб гэтым паведамілі ў Камітэце па ахове здароўя Мінгарвыканкама. У больш чым палове выпадкаў (2653) да лятальнага зыходу прывяла ішэмічная хвароба сэрца. На другім месцы прычын, па якіх паміраюць жыхары сталіцы, — анкалагічныя захворванні — 1684 чалавекі, або 19,2 працэнта. Тут медыкі канстатуюць рост выпадкаў смерці ў параўнанні са студзенем — чэрвенем мінулага года: на 4,3 працэнта сярод мінчан працаздольнага ўзросту і на 4,5 — сярод пенсіянераў. Трэці радок займаюць траўмы, атручэнні і іншыя наступствы ўздзеяння знешніх прычын.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

МАТАЦЫКЛІСТ, БУДЗЬ АСЦЯРОЖНЫ!

За першае паўгоддзе гэтага года на тэрыторыі Мінскай вобласці па віне матацыклістаў адбылося 43 ДТЗ. Пяць чалавек загінула, сярод якіх і 15-гадовы хлопец.

Перад Дзяржаўтаінспекцыяй востра паўстала праблема папярэджання і прафілактыкі аварый з удзелам матацыклістаў. Менавіта з гэтай мэтай і праводзіцца комплекс прафілактычных мерапрыемстваў «Матацыкл». Гэтым разам акцыя прайшла на тэрыторыі Смалявіцкага раёна.

— Часцей за ўсё нам даводзіцца сутыкацца з тым, што многія садзяцца за руль у нецвярозым стане. Таксама матацыклісты любяць ездзіць без шлема, мала хто з іх бярэ з сабою правы. Праўда, не ва ўсіх яны і ёсць. Часта даводзіцца спыняць нявопытных водаў, у якіх яшчэ правоў няма ўвогуле. Мы стала праводзім прафілактычныя мерапрыемствы, папярэджваем, гутарым з людзьмі. Часам гэта дапамагае прадухіліць парушэнне ПДР. Імкнёмся пагутарыць з кожным, у каго ёсць матацыкл. Не так даўно ў Смалявічах матацыкліст не справіўся з кіраваннем, узніклі праблемы з тармазамі. Хлопец атрымаў шматлікія траўмы, зараз ён знаходзіцца ў бальніцы. Ведаеце, праблем з атрыманнем правоў у Смалявічах не ўзнікае, — гаворыць начальнік Дзяржаўтаінспекцыі Смалявіцкага раёна, маёр міліцыі Валерый Найдзенка.

Асноўныя прычыны дарожна-транспартных здарэнняў па віне матацыклістаў — адсутнасць навыкаў кіравання і перавышэнне бяспечнай хуткасці руху. Можна нават скласці партрэт матацыкліста-парушальніка: гэта малады чалавек ва ўзросце ад 16 да 20 гадоў.

— Вялікую ўвагу надаём кантролю за тэхнічным станам мотатэхнікі, законнасцю яе выкарыстання, — гаворыць начальнік аддзела агітацыі і прапаганды кіравання ДАІ УУС Мінскага аблвыканкама Алег Цюрын.

Як паказвае практыка, многія матацыклісты нават не здагадваюцца, што за парушэнне ПДР існуе строгая адміністрацыйная адказнасць. Самае галоўнае, што пры паўторным парушэнні на працягу года наступае ўжо крымінальная адказнасць.

У ходзе акцыі «Матацыкл» выяўляюцца пераабсталяваныя, незарэгістраваныя, сабраныя з запчастак матацыклы, яны знімаюцца з уліку.

Адзін з матацыклістаў не меў ніякага дакумента, які пацвярджаў бы права кіравання транспартам. За гэта прадугледжаны пэўныя санкцыі. Але супрацоўнікі ДАІ патэлефанавалі ў дзяжурную службу, дзе ім паведамілі, што матацыкл не значыцца ў спісе ўкрадзеных, а сам мужчына мае вадзіцельскае пасведчанне, але не ўзяў з сабою. Што рабіць у такім выпадку? Супрацоўнікі ДАІ вырашылі зрабіць проста папярэджанне. Матацыкліст быў вельмі ўдзячны.

— Ведаеце, вось цяпер я ўсё зразумеў. Цяпер буду з большай адказнасцю ставіцца да кіравання матацыклам. Я ж рызыкаваў не толькі сваім жыццём, — кажа Павел.

Сапраўды, не толькі сваім жыццём рызыкаваў гэты вадзіцель. Разам з ім была яшчэ і маладая дзяўчына. Пара ехала з лесу, дзе яны збіралі чарніцы.

А вось у вёсцы Куркава супрацоўнікі ДАІ звярнулі сваю ўвагу на аднаго вадзіцеля, які вёў сябе вельмі дзіўна. Убачыўшы міліцэйскія машыны за некалькі сотняў метраў, мужчына вырашыў змяніць накірунак свайго руху. Гэта выклікала пэўную падазронасць. Аказалася, што не проста так. Вадзіцель не меў правоў. Пры гэтым у машыне сядзела яшчэ пяць чалавек.

Пад увагу супрацоўнікаў ДАІ трапілі таксама маладыя хлопцы, якія ехалі на матацыклах. Трэба было праверыць наяўнасць правоў. Аказалася, што ўсё ў парадку. Да таго ж гэта былі не матацыклы, а скутары. Справа ў тым, што апошнія мадэлі скутараў вельмі падобныя на матацыклы.

А вось яшчэ двум хлопцам ужо не так пашанцавала. Яны ехалі на матацыкле без правоў. Вядома ж, давялося скласці пратакол, каб такое больш не паўтарылася.

— Казала мне маці, што не трэба ездзіць без правоў. А я не паслухаў яе. Вось цяпер і трапіў у такую непрыемную сітуацыю, — кажа хлопец, які ледзь не плакаў, але трымаўся.

Падводзячы вынікі гэтай акцыі, трэба адзначыць, што такія мерапрыемствы вельмі патрэбныя. Па-першае, прафілактыка яшчэ нікому не перашкодзіла. Па-другое, вадзіцелі скутараў вельмі падобныя на матацыклы.

Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ. Фота аўтара.

Чытайце ў наступным нумары

Аўто па восені купляюць...

...Калі адкінуць усе пабочныя фактары, то застануцца два пікі на аўтарынкавай сінусоідзе: вясенняе «абвастрэнне» — традыцыйнае на працягу многіх гадоў, і «постадпускны сіндром» — куды менш вядомы, але даволі важкі ўздым попыту. На першы погляд мудрагелістая назва расшыфроўваецца даволі проста: пасля сезона адпачынкаў у людзей засталіся грошы, на якія яны і вырашаюць набыць ці памяняць «жалезнага каня». Зараз мы знаходзімся напярэдадні як раз такога ўздыму. Каб палегчыць звязаныя з выбарам аўтамабіля клопаты і зменшыць верагоднасць магчымага расчаравання, прапануем вам некаторыя няхітрыя парады. Адны з іх будуць карысныя нават поўным «чайнікам» — людзям, якія ўпершыню сядуць за руль, іншыя стануць падказкай нават тым, хто ўжо «з'ездзіў не адзін аўто» і лічыць сябе сапраўдным профі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.31	20.59	15.28
Віцебск —	5.15	20.54	15.39
Магілёў —	5.21	20.49	15.28
Гомель —	5.23	20.40	15.17
Гродна —	5.47	21.14	15.27
Брэст —	5.53	21.08	15.15

Месяц

Маладзік.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Марыі, Трафіма.*
К. *Караліны, Марыі, Освальда, Станіслава.*

НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні

...у суседзяў

ВАРШАВА	+18..+20°C	КІЕЎ	+16..+18°C
ВІЛЬНЮС	+18..+20°C	МАСКВА	+12..+14°C
РЫГА	+16..+18°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+15..+17°C

Дзве даты

5 жніўня

1506 год — адбылася Клецкая бітва, якая завяршылася першай вялікай перамогай над крымскімі татарамі. 7-тысячнае войска Вялікага Княства Літоўскага пад камандаваннем Міхаіла Глінскага разграміла войска крымскіх татар на рацэ Лань каля Клецка. У 1996 годзе на месцы бітвы пастаўлены помнік.

1963 год — у Маскве прадстаўнікамі ўрадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі падпісаны Дагавор аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, касмічнай прасторы і пад вадой.

Цытата дня:

«Некаторыя рэчы мы робім толькі таму, што яны цікавыя нам. Іншыя цікавыя толькі таму, што мы іх робім».

Тадэвуш Катарбінскі (1886—1981), польскі філосаф.

Беларуская опера выступіць у Германіі

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы Беларусі прыме ўдзел у оперным фестывалі, які пройдзе ў жніўні ў Германіі. У гарадах Маншау і Саарбрукен беларускія артысты прадставяць спектаклі «Мадам Батэрфляй» Джакома Пучыні і «Набуко» Джузэпэ Вердзі. Акрамя таго, салісты Вялікага тэатра оперы Беларусі прымуць удзел у выкананні оперных спектакляў «Тоска» Джакома Пучыні, «Севільскі цырульнік» Джаакіна Расіні. Ну а беларускія гледачы змогуць сустрэцца з калектывам Вялікага тэатра оперы 16 верасня. У гэты дзень адбудзецца адкрыццё 76-га тэатральнага сезона — операй «Аіда» Джузэпэ Вердзі.

Вольга БЕРАСНЕВА, «Мінск—Навіны».

У фондзе Музея старажытнабеларускай культуры з'явілася 12 работ народнага майстра Ніканора Зосіка

Гэта чалавек вельмі складанага лёсу. Нарадзіўся ў 1904 годзе ў вёсцы Заказель — сёння Драгічынскі раён Брэсцкай вобласці. З прыходам савецкай улады стаў старшынёй калгаса. У часы калектывізацыі апынуўся ў сталінскіх лагерах. У 1953 годзе вярнуўся ў сваю вёску, заняўся жывапісам. Ніканор Зосік пісаў алеем нацюрморты, пейзажы, рабіў распісныя дываны. Мастацтвазнаўцы назвалі Зосіка беларускім Прасмані.

Святлана ШЫДЛОЎСКАЯ, «Мінск—Навіны».

Организация сдает в аренду
СКЛАДСКОЕ ПОМЕЩЕНИЕ
в г. Молодечно (центр), 2-этажное, 1400 кв. м., h-4, 2 лифта, кран-балка, хороший ремонт, по цене 3 евро кв. м.
Возможна продажа.
Тел.: 8 029 3 04 06 40, 8 029 775 58 14, 8 01773 7 79 13.
УНН 600414766

Усміхнёмся!

— Света!
— Што?
— Ты мне патрэбна як жанчына.
— Я згодная...
— Колькі каштуюць макароны?

☺

Галоўурач выклікае да сябе студэнта-практыканта:

— Вы што, зусім звар'яцелі? Навошта вы сказалі хворому, што мы збіраемся адрэзаць яму ногі?

Студэнт:

— Каб прымусіць яго хадзіць!

☺

У самалёце пасажыр ляманту е:
— Вой, мне дрэнна! Вой, зараз званіцце!
Сусед па крэсле:
— А вы вось гэтую кнопачку на столі націсніце!
— Націснуў. Ну і што?
— Ну вось. У сцюардэсы загарэлася лямпачка.
— А каб яе! Мне дрэнна! Мяне зараз званіцце! А яна, лайдачка, сама сабе святло уключыць не можа?!

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

Празароўскі

Шчыт падзелены. У правым, блакітным полі паўарла срэбнага з залатымі дзюбай і кіпцюрамі. У левым, срэбным полі тры залатыя шасцікутныя зоркі адна над адной.

Герб роду Прозараў.

Поўня

У чырвоным полі залатая поўня з чалавечым тварам, над ёй залаты чатырохканцовы крыж перакрыжаваны.

Гербам карысталіся: Іваніцкі, Іванкевіч.

Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4196. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12